Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. СУБОТА №194 (28558)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## КРЫНІЦА ДУХОЎНАСЦІ НАЦЫІ

***Работнікам культуры Рэспублікі Беларусь***

*Паважаныя сябры!*

*Шчыра віншую вас з прафесійным святам.*

*Культура — гэта аснова самабытнасці і крыніца духоўнасці нацыі. Яна ўвасабляе ўнікальныя традыцыі беларускага народа. Яе стваральная сіла аб'ядноўвае грамадства, абуджае ў людзей самыя добрыя, светлыя, хвалюючыя думкі і пачуцці.*

*Беларусь ганарыцца сваёй нацыянальнай культурай, якая актыўна развіваецца і паступова набывае сусветнае прызнанне. Дзякуючы вам народная творчасць і прафесійнае мастацтва штогод папаўняюцца яркімі талентамі і новымі дасягненнямі.*

*На вас ускладзена высокая гуманістычная і асветніцкая місія. Вы прывіваеце маладому пакаленню лепшыя маральныя і эстэтычныя якасці і ідэалы, выхоўваеце любоў да прыгожага, павагу да роднай спадчыны, гонар за сваю Радзіму.*

*Упэўнены, ваш энтузіязм, майстэрства і захопленасць прафесіяй будуць і надалей садзейнічаць росквіту нашай дзяржавы.*

*Жадаю вам поспехаў, невычэрпнага творчага натхнення, міру, шчасця і здароўя!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый БОНДАР, міністр культуры:**

*«Установы культуры павінны ўмець самастойна зарабляць. Тут таксама важныя прыватныя ініцыятывы. Нельга сёння ўзяць і прафінансаваць усё з бюджэту. Ёсць кірункі, якія маюць патрэбу ў дзяржпадтрымцы, і яны працягнуць яе атрымліваць. Гэта наша гісторыка-культурная спадчына, акадэмічнае мастацтва. Калі ж гаварыць пра сучасныя камерцыйныя формы забаўляльнага жанру, гэта работа прадзюсараў, інвестараў, людзей, якія ствараюць прадукт і павінны размежаваць перспектывы камерцыйнага выкарыстання і акупнасць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9684 | ▲ |
| Еўра | 2,3017 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0341 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0735 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Абеліскі параненай зямлі

# ГОРКАЯ ПАМЯЦЬ ШКЛЕНІКОВА

## На месцы спаленай вёскі ўжо даўно вырасла новая, але ўсё тут нагадвае пра крывавую расправу гітлераўцаў




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У брацкай магіле пахавана бабуля Уладзіславы Бярняк (у дзявоцтве Чарняўскай). Усяго на помніку — шэсць чалавек з такім прозвішчам...

**Як і большасць маленькіх населеных пунктаў, вёска Шкленікова, што на Мядзельшчыне, ажывае толькі летам. Зімой на з дзясятак хат застаецца двое-трое гаспадароў. А калісьці тут кахалі, нараджалі дзяцей, усёй вёскай адзначалі святы, па-суседску дапамагалі — адным словам, жылі вялікай дружнай сям'ёй. У адно імгненне шчаслівае жыццё перакрэсліла Вялікая Айчынная вайна...**

### АПЕРАЦЫЯ «ФРЫЦ»

26 верасня 1943 года з боку суседняга Княгініна ў вёску, якая знаходзіцца сярод лесу, рушыў густы ланцуг нямецкіх салдат і іх памагатых. Даведаўшыся пра гэта, жыхары Шкленікова сышлі ў балота. У хатах засталіся пераважна старыя, хворыя і інваліды.

Прыйшоўшы ў вёску, карнікі сагналі ў дом Рамана Місуны ўсіх мужчын і жанчын. Забаранілі выходзіць пад страхам смерці. Усю ноч людзі правялі без сну, чакаючы, які лёс іх напаткае. Раніцай 27 верасня фашысты пачалі сартаваць людзей. Старых, хворых, калек і тых, хто асабліва моцна галасіў, сабралі ў адно месца. Астатніх далучылі да калоны нявольнікаў, якіх меркавалася вывезці на катаржныя работы ў Германію. Людзей, што засталіся, гітлераўцы разводзілі па хлявах і гумнах, дзе спакойна расстрэльвалі з аўтамата, дабіваючы пісталетнымі выстраламі.

У хляве Віктара Чарняўскага забілі Аляксандра, Кацярыну і Аўдоццю Чарняўскіх. Да будынка школы прывялі Адама Грышкевіча, які паскардзіўся на холад. «Хутка сагрэешся», — усміхнуўся адзін з гітлераўцаў і прашыў чалавека аўтаматнай чаргой. Затым Адама паклалі на дровы і падпалілі — «сагрэлі»...

Хрысціна Малько, якая з дзіцячых гадоў была інвалідам, схавалася пад печ у сваёй хаце. Не ведала яна, што загіне ў жудасных пакутах: была спалена жывою. Не пашкадавалі фашысцкія каты і Ксенію Іглінскую з дачушкай Юзэфай, якія вярталіся з суседняй вёскі...

Пасля крывавай расправы над людзьмі гітлераўцы спалілі вёску. 58 дамоў і ўсе гаспадарчыя пабудовы згарэлі дашчэнту. Загінула 16 мірных жыхароў.

Ужо потым гісторыкі скажуць: гэта была гітлераўская аперацыя пад назвай «Фрыц», якая знішчала ўсё на сваім шляху ад Браслава да Вілейкі. Некалькі дзясяткаў нямецкіх салдат, знятых з фронту, з аднаго боку, вялі буйнамаштабныя баявыя дзеянні супраць партызан, з другога — наведвалі вёскі і самым жорсткім чынам знішчалі мірнае насельніцтва.

СТАР. 5

**КЛАКСАН**

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ

***«Звязда» прэзентуе новую рубрыку, у якой будуць з'яўляцца матэрыялы, прысвечаныя аўтамабілям — новым мадэлям, асаблівасцям эксплуатацыі, навінам рынку і ўсяму, што з чатырохколавым транспартным сродкам звязана. Плануецца, што рубрыка будзе выходзіць два разы на месяц. Наша мэта — зрабіць яе змест цікавым не толькі для аўтааматараў, кіроўцаў, але і для пасажыраў — а гэта значыць для ўсіх!***

# Як кожны дзень ездзіць на розных аўтамабілях?

## Што такое карпул, і як гэта працуе ў Беларусі

**Не так даўно «Звязда» пісала пра каршэрынг — арэнду аўтамабіля на невялікі тэрмін з пагадзіннай аплатай. Пакуль такі сэрвіс нельга назваць канкурэнтам таксі ці іншых відаў транспарту, але ў якасці альтэрнатывы — ідэя нядрэнная. Аднак каршэрынг — не адзіны варыянт, калі вам захацелася знайсці новы спосаб перамяшчэння па горадзе і за яго межамі. Сёння ў Беларусі актыўна працуе карпулінг — з яго дапамогай чалавек можа хоць кожны дзень ездзіць на новым аўтамабілі, але часцей на пасажырскім сядзенні, пры гэтым аплачваючы толькі паліва. Як функцыянуе карпул у нашай краіне, высветліў наш карэспандэнт.**

СТАР. 11

# Якасць мясцовых дарог зраўняецца з якасцю рэспубліканскіх

## Кіраўнік дзяржавы з рабочым візітам наведаў Мінскую вобласць

**Аляксандр Лукашэнка пабываў у Слуцкім раёне на тэрыторыі саўгаса «Рачкавічы». Тэма паездкі — развіццё мясцовых дарог, а таксама стан сельскай гаспадаркі Мінскай вобласці ў цэлым і Слуцкага раёна, наведанага саўгаса ў прыватнасці.**

Калі трасы міжнароднага і рэспубліканскага значэння ў нашай краіне даволі зручныя і прэтэнзій да якасці пакрыцця няма, то стан мясцовых дарог выклікае пытанні. Некаторы час таму — у красавіку бягучага года — гэтая тэма ўжо ўзнімалася на самым вышэйшым узроўні, тады кіраўнік дзяржавы даручыў разгледзець розныя спосабы будаўніцтва дарог, а таксама прааналізаваць міжнародны вопыт у гэтым кірунку. Мэта — прывесці сетку дарог мясцовага значэння ў належны выгляд, каб імі было зручна карыстацца і мясцовым жыхарам, і тым, хто праездам у гэтым рэгіёне.

— У красавіку мы правялі нараду і канстатавалі факт, што ў нас больш-менш у нармальным стане дарогі міжнародныя і рэспубліканскія. Гэта значыць, высокага ўзроўню дарогі мы прывялі ў нармальны стан, затраціўшы немала сродкаў, у тым ліку і другую кальцавую пабудавалі... Схамянуўшыся — канешне, не было столькі грошай, — мы зразумелі, што ўпусцілі дарогі мясцовага значэння, — нагадаў кіраўнік краіны.

Гэта дарогі, якія злучаюць аграгарадкі, вёскі з райцэнтрам, праходзяць па населеных пунктах. Іх, дарэчы, большасць у краіне — калі лічыць па працягласці.

— І там жывуць людзі, — канстатаваў Прэзідэнт. — І трэба дапамагчы. Мы прынялі рашэнне: да канца гэтай пяцігодкі стварыць праграму аднаўлення і мадэрнізацыі мясцовых дарог, прывядзення іх у парадак.

Якраз у гэтыя дні праходзіць рэспубліканскі семінар па тэхналогіях рамонту і аднаўлення аўтамабільных дарог мясцовага значэння. На першым яго этапе — пятага кастрычніка — на пляцоўках унутрыгаспадарчых дарог саўгаса «Рачкавічы» прайшлі практычныя заняткі з дэманстрацыяй прагрэсіўных тэхналогій рамонту і аднаўлення фундаментаў і пакрыццяў мясцовых аўтамабільных дарог.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, якую дарожна-будаўнічую тэхніку вырабляюць прадпрыемствы нашай краіны, у чым адрозненне розных дарожных пакрыццяў. Паколькі ў нас выкарыстоўваюцца і імпартныя ўзоры такой тэхнікі, Прэзідэнт агучыў асобны загад:

— Прамыслоўцам трэба даручаць, няхай пачынаюць. У нас велізарная сетка дарог, і яе трэба прыводзіць у парадак. І калі мы будзем увесь час набываць імпартныя машыны, навошта тады наша аўтамабілебудаванне?

Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі розныя ўзоры нашай дарожнай тэхнікі, у тым ліку і ў дзеянні.

* * *

Паколькі кіраўнік дзяржавы прыбыў на тэрыторыю саўгаса, асобную ўвагу ён надаў тэме сельскай гаспадаркі. У першую чаргу пацікавіўся, калі нарэшце будзе прыбрана з палёў уся кукуруза. Прынамсі, на тэрыторыі наведанай гаспадаркі яна яшчэ расце... Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што з верталёта яму было відаць: некаторыя ўчасткі кукурузы ўжо наўрад ці можна прыбраць: там стаіць вада і тэхніка не можа туды заехаць.

— Гэта сведчыць пра тое, што мы часам не думаем, дзе сеяць, а яшчэ больш не думаем, як прыбіраць, — канстатаваў Прэзідэнт. — Там, дзе трава павінна быць, вы пасеялі кукурузу, і ў калена вада. Кругом — нізіна, і вада нікуды не сыдзе. Мы на Віцебскай вобласці ўвесь час канцэнтруем увагу на змяненні структуры пасяўных плошчаў, але ў нас жа ёсць раёны і канкрэтныя гаспадаркі, дзе таксама трэба як у Віцебскай вобласці, працаваць — пераглядаючы пасевы.

Спытаў кіраўнік дзяржавы і пра перапрацоўку мяса ў Мінскай вобласці. У прыватнасці, пацікавіўся, колькі там адпаведных прадпрыемстваў і наколькі яны задзейнічаны, колькі трэба яшчэ прадукцыі, каб задзейнічаць іх на поўную моц. Акцэнт, безумоўна, на экспарт. У прыклад Прэзідэнт прывёў нядаўнюю сустрэчу з венесуэльскім лідарам Нікаласам Мадурам. Там гатовы закупаць беларускае сала! У тым, што датычыцца вытворчасці і перапрацоўкі мяса, таксама вялікую ролю адыгрывае спецыялізацыя раёна. Так, Слуцкі, Нясвіжскі раёны, па словах кіраўніка дзяржавы, — гэта тыя раёны, дзе мы павінны атрымліваць мяса.

Разлікі разлікамі, але немалаважную ролю ў любой вытворчасці адыгрывае дысцыпліна. Да гэтага тэзіса Аляксандр Лукашэнка звяртаецца рэгулярна, на ім ён яшчэ раз зрабіў акцэнт, звяртаючыся да губернатара Мінскай вобласці Анатоля Ісачанкі:

— Жалезная павінна быць дысцыпліна. Убачыў, што нешта не так, сказаў адзін раз. Не зрабілі — пытай на ўсю катушку і не глядзі, прыватнае прадпрыемства або не.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*
*Слуцкі раён.*

### ❍ У ТЭМУ

**Анатоль СІВАК, міністр транспарту і камунікацый:**

— Цягам апошняй пяцігодкі мы інтэнсіўна займаліся ў краіне рэспубліканскімі дарогамі, у першую чаргу тымі магістралямі, якія працуюць на транзіт. У гэты перыяд менш сродкаў выдзялялася на мясцовыя дарогі. Галоўная праблема мясцовых дарог — гэта пратэрмінаванасць рамонтаў. Сёння з 80 тысяч кіламетраў патрабуе таго ці іншага ўмяшальніцтва каля 20 тысяч кіламетраў дарог. Найбольш буйныя аб'ёмы — пытанні рэканструкцыі, капітальнага рамонту — гэта сем тысяч кіламетраў, якія прапісалі цяпер у праграме «Дарогі Беларусі». І за тры гады павінны іх вырашыць. Але гэта не азначае, што толькі на сямі тысячах кіламетраў будзем працаваць. Будзем працаваць і на ўсёй сетцы мясцовых дарог.

■ Напярэдадні

# Зялёная эканоміка плюс электратранспарт

**І гэта не адзіныя тэмы, якія будуць разглядацца на Беларускім энергетычным і экалагічным форуме, што пройдзе ў Мінску 10—13 кастрычніка, паведаміў начальнік упраўлення энергаэфектыўнасці, экалогіі і навукі Міністэрства энергетыкі Сяргей ГРЭБЕНЬ.**

Форум уключае ХХІІ Міжнародную спецыялізаваную выстаўку «Энергетыка. Экалогія. Энергазберажэнне. Электра» (EnergyExpo), спецыялізаваную выстаўку тэхналогій для нафтахімічнай галіны Oil & Gas Technologies, святлотэхнічнай прадукцыі «Экспасвятло», «Атамэкспа-Беларусь», «Водныя і паветраныя тэхналогіі», «ЭкспаГорад» і ХХІІ Беларускі энергетычны і экалагічны кангрэс. На мерапрыемстве будзе прадстаўлена сучаснае абсталяванне і тэхналогіі для вытворчасці і размеркавання электрычнай і цеплавой энергіі, аўтаматызаваныя сістэмы і рэсурсазберагальныя тэхналогіі.

Выстаўка EnergyExpo традыцыйна прыцягвае ўвагу вядучых беларускіх і сусветных вытворцаў абсталявання, тэхналогій і матэрыялаў для энергетыкі, экалогіі, энергазберажэння, электратэхнікі і з'яўляецца адной з самых буйных па гэтай тэматыцы ў краінах СНД і Балтыі. Сёлета ў ёй прыме ўдзел каля 300 арганізацый з 16 краін свету (Беларусь, Расія, Украіна, Літва, Латвія, Эстонія, Польшча, Аўстрыя, Германія, Францыя, Італія, Чэхія, Швейцарыя, Фінляндыя, Кітай, ЗША). Сярод удзельнікаў выстаўкі — вядучыя беларускія арганізацыі і вядомыя сусветныя брэнды: Siemens, ABB, FILTER, IEC, Schneider, Dow Chemical, HEAG, EATON і Таўрыда Электрык.

У экспазіцыі прадугледжаны галіновыя раздзелы Міністэрстваў энергетыкі, прамысловасці, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі, Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі. Дзелавая праграма форуму ўключае больш за 20 мерапрыемстваў, на якіх айчынныя і замежныя эксперты прадставяць сучасныя тэхналагічныя рашэнні ў галіне энергетыкі, нафтахіміі, энергазберажэння і экалогіі, пытанні энергетычнай бяспекі, экалагічныя і эканамічныя аспекты ядзернай энергетыкі.

Акрамя таго, адной з цэнтральных тэм форуму, якой будзе прысвечаны асобны круглы стол, стане развіццё электратранспарту. Гэтая тэма асабліва актуальная з улікам апошніх распрацовак беларускіх вучоных і хуткага ўводу ў эксплуатацыю Беларускай АЭС. «Развіццё электратранспарту — гэта яшчэ і павышэнне экспартнага патэнцыялу Беларусі за кошт стварэння новых вытворчасцяў, як непасрэдна транспартных, так і арыентаваных на стварэнне заражднай інфраструктуры», — лічыць Сяргей Грэбень.

А яшчэ начальнік упраўлення запэўніў, што ў Беларусі ў 2020 годзе будуць будавацца толькі энергаэфектыўныя жыллё. Паводле яго слоў, новыя распрацоўкі ў галіне энергаэфектыўнасці абавязкова будуць прадстаўлены на Беларускім энергетычным і экалагічным форуме.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Лаўрэатам Нобелеўскай прэміі міру стала Міжнародная кампанія па забароне ядзернай зброі

Нобелеўская прэмія міру за 2017 год прысуджана Міжнароднай кампаніі па забароне ядзернай зброі (ICAN). Пра гэта, як паведамляе ТАСС, абвясціла старшыня Нарвежскага нобелеўскага камітэта Берыт Райс-Андэрсан. Адзначаецца, што прэмія прысуджана за «прыцягненне ўвагі да катастрафічных гуманітарных наступстваў любога прымянення ядзернай зброі і неверагодныя намаганні, накіраваныя на тое, каб дабіцца прыняцця дамовы аб забароне падобнай зброі». У 2017 годзе на прэмію міру было вылучана 318 кандыдатаў, у тым ліку 103 арганізацыі. У 2016 годзе лаўрэатам Нобелеўскай прэміі міру стаў прэзідэнт Калумбіі Хуан Мануэль Сантас за «рашучыя намаганні, накіраваныя на тое, каб пакласці канец больш чым 50-гадовай грамадзянскай вайне ў краіне».

### У Вярхоўнай радзе з-за бойкі паміж дэпутатамі аб'яўлены перапынак

Некалькі дзясяткаў дэпутатаў заблакавалі месца спікера Вярхоўнай рады Украіны і спрабавалі пашкодзіць абсталяванне ў прэзідыуме, каб перашкодзіць прыняццю ўнесеных прэзідэнтам Пятром Парашэнкам ініцыятыў — законапраекта аб рэінтэграцыі Данбаса, а таксама аб статусе рэгіёна.

Спікер Вярхоўнай рады, каб пазбегнуць бойкі сярод дэпутатаў, аб'явіў перапынак у рабоце парламента для правядзення кансультацый. «Я аб'яўляю перапынак», — сказаў ён, з цяжкасцю дабраўшыся да свайго мікрафона.



У сераду, 4 кастрычніка, прэзідэнт Украіны ўнёс у Раду законапраект «Аб асаблівасцях дзяржаўнай палітыкі па забеспячэнні дзяржаўнага суверэнітэту Украіны на часова акупаваных тэрыторыях у Данецкай і Луганскай абласцях». У ім непадкантрольныя Кіеву раёны Данбаса называюцца «часова акупаванымі тэрыторыямі», а дзеянні Расіі кваліфікуюцца як «агрэсія супраць Украіны». Прэзідэнту ж прадастаўляецца права на выкарыстанне ўзброеных сіл для іх вызвалення. У той жа дзень Парашэнка зарэгістраваў і законапраект аб статусе Данбаса. Профільны камітэт у чацвер рэкамендаваў парламенту прыняць абодва законапраекты, унёсшы папраўкі.

Супрацоўнікі праваахоўных органаў ва ўзмоцненым рэжыме ахоўваюць правапарадак ва ўрадавым квартале сталіцы.

### Трамп пасля нарады з ваеннымі абвясціў пра «зацішша перад бурай»

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп пасля сустрэчы ў Белым доме з членамі амерыканскага ваеннага камандавання зрабіў «спантанную» і «загадкавую» заяву, перадае Reuters.

«Можа быць, гэта зацішша перад бурай», — адазваўся амерыканскі лідар аб праведзенай нарадзе падчас фотасесіі. «У гэтым пакоі присутнічаюць вялікія сусветныя ваеначальнікі», — дадаў ён, не растлумачыўшы пры гэтым, што менавіта меў на ўвазе пад сваёй іншасказальнай фразай. «Даведаецеся [што будзе]», — запэўніў журналістаў палітык у адказ на ўдакладняючае пытанне.

Якія менавіта тэмы абмяркоўваліся на гэтым пасяджэнні, невядома, заўважае агенцтва. Аднак зараз Трамп, як тлумачыць Reuters, вырашае пытанне аб тым, ці варта разрываць ядзерную здзелку з Іранам. Пасля сустрэчы з ваеннымі чыноўнікамі ён чарговы раз заявіў аб парушэнні Тэгеранам «духу» гэтага пагаднення. «Мы не павінны дапусціць, каб Іран атрымаў ядзерную зброю», — адзначыў Трамп.

# ПАГЛЫБЛЕННЕ ФАРВАТАРУ — ЦЯПЕР РЭАЛЬНАСЦЬ

**Новы міжнародны порт можа хутка з'явіцца ў вёсцы Ніжнія Жары, што на Брагіншчыне. Гэты населены пункт знаходзіцца за пяцьсот метраў ад мяжы з Украінай.**

На Х Міжнародным інвестыцыйным форуме «Таўрычаскія гарызонты: супрацоўніцтва, інвестыцыі, эканамічнае развіццё», які прайшоў у Новай Кахоўцы на Херсоншчыне, падпісаны трохбаковы мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Херсонскай абласной дзяржаўнай адміністрацыяй, Гомельскім абласным выканаўчым камітэтам і кампаніяй «Нібулон» (г. Нікалаеў). Дарэчы, шматпрофільнае прадпрыемства — адзін з самых буйных аператараў збожжавага рынку Украіны, ва ўласнасці якога — у тым ліку сучасны грузавы флот і суднабудаўнічы завод. Ідэя пра аднаўленне суднаходства на Дняпры была сёлета ў маі абмеркавана прэзідэнтамі Аляксандрам Лукашэнкам і Пятром Парашэнкам.

— Вырашэнне пытання да гэтага часу ўпіралася ў вызначэнне крыніцы фінансавання на тэрыторыі Украіны, — адзначыла **прэс-сакратар Гомельскага аблвыканкама Вольга РАБІКАВА.** — Беларусь ужо не першы год вядзе актыўную прапрацоўку пытання па будаўніцтве порта на глыбакаводным участку Дняпра. Ідэя ў тым, каб загружаць у ім судны класа «рака — мора», якія змогуць дастаўляць грузы праз Чорнае мора ў краіны Еўропы, Азіі і Афрыкі.

У тым, што водны шлях будзе запатрабаваны, абодва бакі не сумняваюцца. Ёсць вялікі патэнцыял для арганізацыі перавозак уніз па Дняпры традыцыйных для Беларусі грузаў: нафтапрадуктаў Мазырскага НПЗ, лесу, будматэрыялаў, прадукцыі чорнай металургіі. З уводам Петрыкаўскага горна-абагачальнага камбіната ўзрасце грузапаток калійных угнаенняў. З Украіны могуць пайсці нафта, сыравіна для хімічнай вытворчасці, шрот, прадукты харчавання і яшчэ многа з таго, што цяпер увозіцца ў Беларусь па чыгунцы ці на аўтамабілях.

Першачарговая задача ў рэалізацыі гэтага праекта — аднаўленне паўнавартаснай работы суднаходнага шляху Е-40 і рачных перавозак на маршруце Балтыйскае мора — Гданьск — Днепр — Чорнае мора. Для гэтага неабходны работы па паглыбленні дна на перакатах Дняпроўскага і Днепрадзяржынскага вадасховішчаў і павялічыць габарыты воднага шляху на ўчастку Кіеўская ГЭС — Ніжнія Жары, што забяспечыць праход суднаў класа «рака — мора».

Традыцыйны эканамічны інтарэс вобласці — пашырэнне рынкаў збыту і павелічэнне паставак сельскагаспадарчай тэхнікі. Цяпер ва Украіне парк камбайнаў прадпрыемства «Гомсельмаш» налічвае амаль дзве тысячы адзінак. Гомельшчына зацікаўлена развіваць гэтую тэму, у тым ліку стварыць у Херсоне зборачную вытворчасць. Гэтаму павінна садзейнічаць рэалізацыя падпісанага дылерскага дагавора паміж «Гомсельмашам» і Херсонскім машынабудаўнічым заводам. Таксама кіраўніцтвам Херсонскай вобласці праведзены перамовы з кіраўніцтвам прадпрыемства «Гомельаблдарбуд» наконт стварэння партнёрскага прадпрыемства.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# МІНІСТРЫ НА СУВЯЗІ

**Кіраўнікі дзяржорганаў правядуць у кастрычніку прамыя тэлефонныя лініі, паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада.**

**7 кастрычніка** прамую тэлефонную лінію правядуць **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, міністр культуры Юрый БОНДАР, міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей ПАПКОЎ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАЯЦ, міністр фінансаў Уладзімір АМАРЫН.**

**14 кастрычніка** на прамой тэлефоннай сувязі з насельніцтвам будуць **міністр прыродных рэсурсаў і ахвы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК, міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй ГАЕЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН, старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоль ЛАПО.**

**21 кастрычніка** прамую тэлефонную лінію правядуць **міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ, міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.**

**28 кастрычніка** можна будзе звязацца з **міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандрам ЦЕРАХАВЫМ.**

Акрамя кіраўнікоў дзяржорганаў, прамыя тэлефонныя лініі правядуць іх намеснікі.

Час правядзення прамых тэлефонных ліній — з 09.00 да 12.00.

■ Нешараговая дата

# Сёння дзень нараджэння «брэжнеўскай» канстытуцыі

**Спаўняецца 40 год дакументу, які прыкладна паўтара дзясятка гадоў з'яўляўся лёсавызначальным для найбуйнейшай краіны свету — Савецкага Саюза. Прынятая 7 кастрычніка 1977 года Канстытуцыя СССР прыйшла на змену так званай сталінскай — ад 5 снежня 1936 года.**

Прынцыпова варыянт «брэжнеўскай» канстытуцыі 1977 года не адрозніваўся ад папярэдняга Асноўнага закона. У той жа час у новай Канстытуцыі з'явілася прэамбула. У адпаведнасці з Канстытуцыяй, дзяржава абвяшчалася сацыялістычнай і агульнанароднай, яе палітычнай асновай выступалі Саветы народных дэпутатаў, эканамічнай асновай — сацыялістычная ўласнасць на сродкі вытворчасці ў выглядзе дзяржаўнай і кааператыўна-калгаснай уласнасці.

У аснове дзяржаўнага ўладкавання быў прынцып сацыялістычнага федэралізму — свабоднае аб'яднанне раўнапраўных рэспублік з правам выхаду з Саюза. Акрамя гэтага, Канстытуцыя замацоўвала ролю партыі як кіруючай і накіроўваючай сілы савецкага грамадства. Сярод функцый партыі — вызначэнне кірунку развіцця грамадства, а таксама лініі ўнутранай і знешняй палітыкі СССР.

У параўнанні з папярэднім Асноўным законам у Канстытуцыі СССР 1977 года быў значна пашыраны раздзел аб правах і абавязках грамадзян. З'явілася права на ахову здароўя, на жыллё, права ўдзельнічаць у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі. Услед за саюзнай Канстытуцыяй былі прыняты і канстытуцыі саюзных і аўтаномных рэспублік. Так, Канстытуцыя БССР была прынята 14 красавіка 1978 года.

З 1978 па 1991 гады 7 кастрычніка — Дзень Канстытуцыі — з'яўлялся непрацоўным днём.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «...ПРАЗ ГАЗЕТУ МОВА ЗАВАЁЎВАЕ ДУШЫ»

**За што можна ўпадабаць чалавека? Мне здаецца, за тое, што ён цікавы, што ён не падвядзе і не падмане, за тое, што да яго ты можаш звярнуцца ў любы час і з самым патаемным, за тое, што ён блізкі табе па душы.**

Вось так і з газетай, хоць пазнаёміліся мы, на жаль, зусім не ў мінулым стагоддзі. Я толькі гадоў 15 выпісваю і пастаянна чытаю «Звязду».

Але ж пры гэтым не расказаць, колькі цікавага, патрэбнага і павучальнага знайшла на яе старонках! Ніколі не прапускала і не прапускаю артыкулы Святланы Яскевіч, Алены Ляўковіч, Веранікі Канюты, Сяргея Расолькі, з нецярпеннем чакала і чакаю «Простую мову» Валянціны Доўнар. А з якімі разумнымі і вясёлымі людзьмі пазнаёміла яе конкурсы «...Народ на провадзе!», «Хто каго?»!

Не прапусціш і «Фотасловы» Яўгена Пясецкага. Без увагі, без роздуму не пакінеш здымкі Анатоля Клешчука. Асобныя з іх нагадваюць творы імпрэсіяністаў.

Даспадобы і звяздоўская «Сямейная газета», з цікавасцю чытаю, чым жыве наша моладзь, як працуе «блізкая ўлада»...

Але ж галоўная адметнасць «Звязды» — не толькі яе блізкасць да людзей, але і родная мова. Праз газету (мяркую па сабе) яна заваёўвае душы, нагадвае, хто мы такія, адкуль.

І таму я вельмі хачу, каб чытачоў у «Звязды» было як найбольш, каб наша першая з дзвюх дзяржаўных моў сапраўды стала першай, каб пашырала свой уплыў у грамадстве.

**Валянціна ГУДАЧКОВА,** *г. Жыткавічы.*

***P.S.** Вы таксама выпісваеце альбо купляеце ў кіёсках «Звязду»? І хацелі б расказаць, чаму? Калі ласка! Самыя цікавыя лісты будуць змешчаны на старонках газеты*

■ Пра лекі

# ПА ЗНІЖАНЫМ КОШЦЕ

**Аналіз цэн на імпартныя лекі ў Беларусі і сумежных краінах — такіх як Польшча і Расія — паказаў, што замежныя пастаўшчыкі выстаўляюць для беларусаў больш высокія кантрактныя цэны прыкладна на 200 прэпаратаў.**

Аб гэтым на пасяджэнні рабочай групы па пытанні аналізу рынку лекавых сродкаў заявіў **генеральны дырэктар РУП «Белфармацыя» Вячаслаў ГНІЦІЙ.** Ён таксама агучыў фактары, ад якіх у кожнай краіне залежаць кантрактныя цэны на лекі — гэта палітыка вытворцы пры пастаўках, частата апошніх, аб'ём рынку, наяўнасць або адсутнасць мытных бар'ераў, лакалізацыя вытворчасці, патрабаванні дзяржавы да працэсу рэгістрацыі, упакоўкі, захоўвання і транспарціроўкі.

Адначасова беларускі бок правеў перамовы з такімі кампаніямі, як «Гедэон Рыхтэр», «Санофі Авенціс», «КРКА» і іншымі. У выніку ўдалося дасягнуць зніжэння кантрактных цэн на 77 найменняў. Зніжка склала ад 10 да 66 працэнтаў. Асобныя лекі пастаўляюцца ўжо зараз па зніжаным кошце. На пачатак кастрычніка на 1,5—57 працэнтаў зніжаны адпускныя цэны на 32 найменні айчынных лекаў.

Як паведамляюць у Міністэрстве аховы здароўя Беларусі, сёння ў нас створана строгая сістэма кантролю якасці лекаў (падчас ажыццяўлення рэгістрацыі і ўвозу на тэрыторыю краіны), што выключае магчымасць траплення няякасных, фальсіфікаваных лекаў. Расходы на гэты ўзмоцнены кантроль і невялікі аб'ём рынку не заўсёды даваляюць замежным вытворцам, пастаўшчыкам знізіць кантрактны кошт да ўзроўню сумежных дзяржаў. Расія тым часам лакалізавала вытворчасць асобных найменняў на сваіх фармпрадпрыемствах, а таму цэны на той тэрыторыі заканамерна пайшлі ўніз. Пакуль гэтыя лекі не атрымалі дзяржаўнай рэгістрацыі ў Беларусі. Як толькі гэта будзе зроблена, зніжэнне павінна адбыцца і ў нас. Адначасова наша краіна таксама мае намер лакалізаваць вытворчасць некаторых замежных прэпаратаў на ўласных фармпрадпрыемствах, але працэс гэта не хуткі. Варта нагадаць, што з лета мінулага года Міністэрства аховы здароўя ўводзіла дадатковыя меры па зніжэнні і стрымліванні цэн — для 1 348 найменняў лекавых прэпаратаў былі ўведзены канкрэтныя памеры рэкамендаваных граничных розничных цэн, па якіх юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі ажыццяўляецца розничная рэалізацыя.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ На слыху

# МОЛАДЗЬ ЗБІРАЕЦЦА Ў СОЧЫ

**Падрыхтоўка да ўдзелу дэлегацыі нашай краіны ў XIX Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў уваходзіць у актыўную стадыю. У сталіцы прайшла рабочая сустрэча арганізатараў з дэлегатамі. Гэта своеасаблівая пераклічка і знаёмства ўдзельнікаў адзін з адным перад вылетам у Сочы, які адбудзецца ўжо на наступным тыдні.**

Як адзначыў **першы сакратар мінскай гарадской арганізацыі БРСМ Сяргей КЛІШэвіч,** беларуская дэлегацыя налічвае 300 маладых людзей. Кожны з іх едзе на гэта маштабнае мерапрыемства, каб знайсці новыя кантакты і абмяняцца вопытам па сферах сваіх інтарэсаў. «Але ва ўсіх нас сёння адна мэта. Асноўная наша задача — паказаць Беларусь як эканамічна-развітую, перспектыўную, краіну, у якой праводзіцца здаровая маладзёжная палітыка. Мы таксама хочам убачыць, як сёння падтрымліваецца моладзь у іншых краінах. Гэты аўтарытэтны сусветны фестываль — мост, дзякуючы якому магчыма будаваць і развіваць партнёрскія адносіны з прадстаўнікамі ўсяго свету», — растлумачыў Сяргей Клішэвіч. Не менш адказнай задачай для беларускай дэлегацыі будзе запрасіць прадстаўнікоў усіх краін наведаць Беларусь у 2019 годзе падчас Еўрагульняў. «Таксама мы хочам паказаць сябе як спартыўную дзяржаву. У нас ёсць патэнцыял для таго, каб сабраць у Беларусі ўвесь свет і прадэманстраваць добры ўзровень арганізацыі Еўрагульняў-2019», — рэзюмаваў Сяргей Клішэвіч.

Чакаецца, што ўдзельнікамі фестывалю стануць больш за 20 тысяч маладых людзей з 150 краін свету. На адной міжнароднай арэне сустрэнуцца прадстаўнікі самых розных сфер і кірункаў ад журналістаў і спартсменаў да інжынераў і праграмістаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Фінансы

# Рэзервы краіны больш за 7,2 млрд долараў

**Золатавалютныя рэзервы Беларусі, падлічаныя ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду, на 1 кастрычніка склалі 7,267 млрд долараў у эквіваленце, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.**

За верасень рэзервы выраслі на 273,1 млн долараў (на 3,9%) пасля росту ў жніўні на 328,8 млн долараў (на 4,9%). За студзень—верасень гэтага года прырост рэзерваў склаў 2 339,5 млн долараў (47,5%). Павелічэнню міжнародных рэзервовых актываў у верасні спрыяла паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку за кошт сродкаў дзяржаўнага фінансавага крэдыту ўрада Расійскай Федэрацыі і збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты.

Станоўчы ўплыў на рост рэзерваў таксама аказала павелічэнне кошту манетарнага золата і паступленне сродкаў ад продажу Нацыянальным банкам аблігацый, намінаваных у замежнай валюце. Урадам і Нацыянальным банкам у верасні выканана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 450 млн долараў.

У 2016 годзе золатавалютныя рэзервы Беларусі ў міжнародным вызначэнні павялічыліся на 751 млн долараў, ці на 18%, да 4,927 млрд долараў (у эквіваленце) на 1 студзеня 2017 года. Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2017 год прадугледжаны рост золатавалютных рэзерваў не менш як на 500 млн долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ

### Максім абвешчаны ў міжнародны вышук

**Хлопчык, які прапаў у Белавежскай пушчы яшчэ 16 верасня, аб'яўлены ў міжнародны вышук, паведамляе Следчы камітэт.**

Органы ўнутраных спраў Беларусі накіравалі па ліні Інтэрпола інфармацыю пра яго, перадалі фатаграфію і апісанне. Гэтыя звесткі цяпер будуць даступныя для спецыялістаў 99 працэнтаў краін. Паколькі ў праваахоўнікаў іншых дзяржаў цяпер ёсць фатаграфія і апісанне хлопчыка, пры яго магчымым знаходжанні за межамі краіны гэтая інфармацыя будзе аператыўна перададзена ў Беларусь.

Нагадаем, раней Следчы камітэт завёў крымінальную справу па факце знікнення 10-гадовага Максіма Мархалюка, жыхара аграгарадка Новы Двор Свіслацкага раёна. Расследаванне працягваецца, разглядаецца шырокі спектр версій таго, што адбылося. Нядаўна з'явілася інфармацыя аб быццам бы «польскім следзе» знікнення хлопчыка, аднак у далейшым яна не пацвердзілася. Як паведамлялася, валанцёры ў пошуках удзелу ўжо не бяруць, гэтым займаецца міліцэйскае спецпадраздзяленне.

### Пенсіянер трапіў у жатку

**У Стаўбцоўскім раёне сур'ёзна пацярпеў пенсіянер, які трапіў у жняярку камбайна на кукурузным полі.**

Паводле інфармацыі ўпраўлення Следчага камітэта па Мінскай вобласці, пры ўборцы кукурузы ў жняярку кормаўборачнага камбайна трапіў 89-гадовы жыхар Стаўбцоўскага раёна. Механізатар, як толькі гэта ўбачыў, спыніўся і выключыў яе, але мужчына ўжо быў сур'ёзна траўмаваны. Пацярпелага неадкладна даставілі ў рэанімацыйнае аддзяленне Стаўбцоўскай ЦРБ з дыягназам траўматычная ампутацыя абедзвюх ног. Устаноўлена, што пенсіянер дрэнна чуў. Падчас агляду месца здарэння канфіскаваны веласіпед, на якім ён прыехаў на поле з суседняй вёскі, торба з кукурузай, слыхавы апарат і іншыя прадметы.

### Угоддзі чакаюць добраахвотнікаў

**Акцыя «Чысты лес» пройдзе ў Беларусі 7 кастрычніка. Мерапрыемства адбудзецца па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі. Асноўная мэта добраахвотнай акцыі — прыцягнуць увагу грамадскасці да неабходнасці беражлівага адносіцца да лесу і не засмечваць яго.**

Штогод арганізацыі Мінлясгаса накіроўваюць значныя сілы і сродкі на работы па навядзенні парадку ў лясным фондзе. Разам з тым праблема несанкцыянаваных звалак бытавых і будаўнічых адходаў, іншых старонніх прадметаў у лясах, якія прымыкаюць да аўтамабільных і чыгуначных дарог, вакол населеных пунктаў, садаводчых таварыстваў і дачных кааператываў, на пляцоўках адпачынку і аўтастаянках па-ранейшаму застаецца актуальнай.

У сувязі з гэтым Міністэрства лясной гаспадаркі заклікае ўсіх неабыякавых жыхароў краіны аб'яднаць намаганні і ўнесці свой уклад у навядзенне парадку: добраўпарадкаваць лясны фонд, прылеглую да сваіх населеных пунктаў тэрыторыю. Стаць удзельнікам акцыі можа кожны ахвотны. Для гэтага дастаткова звярнуцца ў любое лясніцтва і заявіць пра сваё жаданне дапамагчы ў навядзенні парадку ў лесе. Арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі забяспечаць усіх удзельнікаў мерапрыемства неабходным інвентаром.

### Жанчына скрала... арэлі

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Фрунзенскага РУУС сталіцы затрымалі 36-гадовую жанчыну, якая падазраецца ў здзяйсненні крадзяжу двух дзіцячых арэляў са двара па вуліцы Школьнай.**

У міліцыю звярнуўся мужчына, які паведаміў, што, выходзячы ранкам з пад'езда на работу, не знайшоў у двары дома двух дзіцячых арэляў. Апошнія ён набыў за ўласныя грошы для добраўпарадкавання тэрыторыі. Праваахоўнікі ўстанавілі, што арэлі былі скрадзены каля апоўначы, а падазраваная ў здзяйсненні злачынства — 36-гадовая непрацоўная мінчанка, якая раней ужо прыцягвалася да крымінальнай адказнасці. Далёка знесці жалезныя арэлі ёй не ўдалося, таму дапамагчы ў гэтай справе яна папрасіла свайго знаёмага. Пасля жанчына здала іх на металалом, а атрыманыя грошы патраціла на свае патрэбы. Гараджанцы пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Інтэрв'ю з нагоды

# «У ВЁСКАХ ЧАКАЮЦЬ ПРЫХОДУ ПАШТАЛЬЁНАЎ»

## Генеральны дырэктар Белпошты — пра тарыфы на паслугі, аператыўную дастаўку і важнасць прафесіі

**Кур'еры, аператары, кіроўцы... Больш за 20 тысяч чалавек працуе сёння на Белпошце. І ў разы больш — карыстаюцца яе паслугамі. У які б час ні зайшоў у аддзяленне сувязі, заўсёды ёсць людзі: адпраўляюць лісты, аплачваюць жыроўкі, атрымліваюць пенсіі і сацыяльныя дапамогі. Якія інавацыі ўкараняе прадпрыемства? Ці могуць жыхары глыбінкі разлічваць на аператыўную дастаўку пісьмаў, прэсы і тавараў? І чаму робаты не здольныя замяніць паштальёнаў? Пра гэта напярэдадні прафесійнага свята «Звязда» пагутарыла з генеральным дырэктарам Белпошты Уладзімірам МАТУСЕВІЧАМ.**



***— Наколькі паштовыя паслугі сёння даступныя насельніцтву?***

— Прадпрыемства ахоплівае ўсю краіну і абслугоўвае людзей у больш чым 20 тысячах населеных пунктаў. У тым ліку і ў маленькіх вёсках, дзе, па зразумелых прычынах, няма ні банка, ні крамы — туды дабіраюцца нашы перасовачныя аддзяленні. Можна сказаць, нясём сацыяльную нагрузку. Усяго ў краіне працуе каля 3,3 тысячы аб'ектаў сувязі. Каб больш якасна і хутка абслугоўваць насельніцтва, мы пераходзім на мотадастаўку: ёй ахоплена больш за 60 працэнтаў населеных пунктаў. Аўтапарк прадпрыемства налічвае паўтары тысячы аўтамабіляў, якія штодзень праязджаюць 150 тысяч кіламетраў.

**«У першым квартале 2018-га плануем запусціць мабільную праграму, з дапамогай якой кліент зможа атрымаць доступ да паштовых паслуг у любым месцы».**

Ёсць сацыяльны стандарт дастаўкі пошты: у сталіцы і абласных цэнтрах гэта шэсць дзён на тыдзень, у астатніх пунктах — пяць. Такім чынам, нават сельскі жыхар атрымлівае выпісаную газету ў дзень яе выхаду.

***— А што наконт даступнасці ў цэнавым плане?***

— Калі паглядзець на краіны, напрыклад, Еўразійскага эканамічнага саюза, то цэны супараўнальныя. Разумееце, цяпер рынкавая эканоміка, і калі тарыфы на паслугі будуць дарагія і не задаволяць чалавека, ён проста не звернецца да нас наступным разам. Таму мы фарміруем цэны, зыходзячы з аналізу рынку, сваіх фінансавых магчымасцяў. Мы не адзіны пастаўшчык паштовых паслуг, ёсць прыватныя аператары, таму прадпрыемству трэба заставацца канкурэнтаздольным у гэтых умовах.

***— Сёння кліенты вельмі цэняць час. Ці можна ў аддзяленні аплаціць «камуналку», скажам, за дзесяць хвілін?***

— Можна нашмат хутчэй. Цяпер імкліва ідзе ўстаноўка электроннай чаргі. Гэта скарачае час чакання: людзей размяркоўваюць па аперацыйных вокнах у залежнасці ад віду паслуг і гэтым самым аптымізуюць працэс. Да таго ж працуе каля тысячы плацежна-даведачных тэрміналаў, з дапамогай якіх можна заплаціць за камунальныя паслугі, афарміць падпіску, прасачыць шлях пасылкі, папоўніць баланс на тэлефоне. У сталіцы таксама ўсталяваны 41 тэрмінал самаабслугоўвання SmartPOST для адпраўкі заказной пісьмовай карэспандэнцыі.

***— Ці паспявае пошта ісці ў нагу з часам? Якія інавацыі ўкараняеце?***

— Мы стараемся замацавацца на рынку электронных паслуг. Так, сёння на сайце прадпрыемства можна адсочваць як міжнародныя, так і ўнутраныя паштовыя адпраўленні, афармляць падпіску на друкаваныя выданні ў рэжыме анлайн.

Развіваем і новыя для пошты кірункі. У прадпрыемства ёсць свая інтэрнэт-крама. Там прадстаўлена дзевяць тысяч найменняў тавараў ад больш чым 230 айчынных вытворцаў. Так мы папулярызуем беларускую прадукцыю. У тым ліку і за мяжой: тавары з анлайн-крамы могуць заказваць жыхары Расіі. У найбліжэйшы час гэта стане даступна і для іншых краін СНД і далёкага замежжа.

Белпошта супрацоўнічае з многімі інтэрнэт-крамамі. Паколькі ў нас самая шырокая лагістычная сетка ў краіне, прадастаўляем кур'ерскія паслугі: выступаем пасярэднікам паміж прадаўцом і пакупніком.

***— Якія навінкі чакаць у найбліжэйшым будучым?***

— Мы і далей будзем ісці па шляху аўтаматызацыі. Мадэрнізуем партал Белпошты. Тэставая версія з'явіцца ўжо ў пачатку наступнага года. У першым квартале 2018-га плануем таксама запусціць мабільную праграму, з дапамогай якой кліент зможа атрымаць доступ да паштовых паслуг у любым месцы. Без гэтага сёння немагчыма развівацца буйному прадпрыемству ў нашай сферы.

***— Белпошта часта ўдзельнічае ў міжнародных выстаўках і прымае замежныя дэлегацыі. Як нашага аператара ацэньваюць на сусветным узроўні?***

— Мы займаем верхнія радкі розных рэйтынгаў у галіне сувязі. Беларуская пошта прызнана адной з найлепшых у свеце па ўзроўні развіцця электронных паслуг. Яна першая ў рэгіёне СНД атрымала сертыфікат S42 Сусветнага паштовага саюза, які пацвярджае міжнародны стандарт адрасавання.

Высокія ўзнагароды атрымліваюць айчынныя маркі. З нядаўняга: на Венскай міжнароднай філатэлістычнай выстаўцы WIPA паштовы блок «Пчалярства ў Беларусі» ўвайшоў у дзясятку найлепшых па выніках міжнулага года. А на сусветнай выстаўцы ў Бандунгу (Інданезія), што праходзіла ў жніўні, кніга нашых марак атрымала сярэбраны медаль.

Мы супрацоўнічаем з калегамі з Расіі, Казахстана, Кітая, Азербайджана, Эстоніі і іншых краін. Міжнародныя пляцоўкі патрэбныя для таго, каб абменьвацца вопытам і знаходзіць агульныя рашэнні, бо і праблемнае поле, і задачы, якія стаяць перад поштамі розных дзяржаў, у прынцыпе аднолькавыя — гэта эканамічнае развіццё, аказанне якасных і своечасовых паслуг і, вядома, выкананне сацыяльных задач.

***— Сколкава аднесла паштальёна да ліку выміраючых прафесій. Па іх прагнозах, з-за працэсаў аўтаматызацыі, яна знікне ўжо ў 2020 годзе. Што скажаце на гэта?***

— Не згодны. Так, паслугі можна аказваць дыстанцыйна. Але людзі, якія жывуць у аддаленых вёсках, на хутарах, чакаюць прыходу паштальёна. Не толькі, каб атрымаць пенсію і прэсу, але і каб пагутарыць. Для многіх гэта сувязь са знешнім светам. Прафесія паштальёна, верагодна, крыху зменіцца, але, безумоўна, застанецца. І будзе карыстацца попытам далёка за мяжой 2020 года, пра якую казалі спецыялісты Сколкава.

***— Сучасны работнік пошты — гэта...***

— Чалавек прафесійны, які добра валодае камп'ютарнымі тэхналогіямі. Да спецыялістаў прадпрыемства прад'яўляюцца высокія стандарты патрабаванняў. Важна, каб і надалей пошта заставалася запатрабаванай, блізкай, надзейнай.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

### Дарэчы

Сусветны дзень пошты адзначаецца 9 кастрычніка. Першапачаткова ён быў устаноўлены ў Токіа ў 1969 годзе як нагода для святкавання гадавіны стварэння ў 1874-м Сусветнага паштовага саюза. Сёння яго галоўная мэта — павысіць дасведчанасць аб ролі пошты ў паўсядзённым жыцці людзей, а таксама аб яе ўкладзе ў глабальнае сацыяльна-эканамічнае развіццё.

З нагоды свята ў асобных аддзяленнях сувязі 9 кастрычніка (панядзелак) прапануюць паўдзельнічаць у тэматычнай віктарыне. Супрацоўнікі падрыхтавалі кліентам пазнавальныя пытанні аб гісторыі прадпрыемства і паштовых паслугах. Удзельнікі, якія выдатна справяцца з заданнем, атрымаюць памятныя сувеніры. Таксама ў гэты дзень падарункі ўручаць кожнаму маленькаму наведвальніку паштамта. У Мінску, Брэсцкай і Магілёўскай абласцях віктарына пройдзе з 11.00 да 12.00, на Віцебшчыне — з 12.00 да 13.00, на Гомельшчыне — з 15.00 да 16.00, у аддзяленнях Гродзенскага філіяла — з 10.00 да 15.00, Мінскай вобласці — з 14.00 да 16.00. Больш падрабязную інфармацыю можна паглядзець на сайце прадпрыемства.

■ Памяць роднай зямлі

# Каменны летапіс Анатоля Вялічкі

Зямля камунараў — мясціны ў Любанскім раёне, услаўленыя працай былых чырвонаармейцаў, заснавальнікаў першай гаспадаркі на меліяраваных землях. Гэту зямлю і яе гаспадароў апеў Янка Купала ў паэме «Над ракою Арэсай». Шмат працоўных і баявых подзвігаў захаваў летапіс гэтых мясцін. Удзячная памяць натхняе землякоў шукаць імёны герояў мінулых часоў і папаўняць імі летапіс народнай славы.



Былы дырэктар Сосначскай сярэдняй школы №1 Анатоль Вялічка робіць свой уклад у стварэнне такога летапісу. Уклад гэты важкі ў прамым і пераносным сэнсе. Камяні агульнай вагою ў тоны сталі для яго матэрыялам своеасаблівых мемарыялаў. У многіх памятных месцах на тэрыторыі сельсавета краязнаўца ўсталяваў вялікія камяні з тлумачальнымі надпісамі. Так, напрыклад, цэлы каменны ансамбль, акружаны кветкамі, нагадвае пра тое, што ў часы вайны партызаны разграмілі тут гарнізон захопнікаў. Ахвярам ваеннага ліхалецця прысвечаны камень-помнік на месцы спаленай вёскі Камуна, дзе было 210 хат.




Цікава ўвасобіў Анатоль Вялічка і памяць пра жыццёвы шлях Янкі Купалы. Перад мясцовай школай можна ўбачыць вялікую паляну з прыгожымі палявымі камянямі. Пераходзячы ад аднаго да другога, чытаючы надпісы, нібы ідзеш услед за Песняром з горада ў горад, з вёскі ў вёску, дзе ў свой час яму давялося пражываць.




— Якой будзе новая старонка каменнага летапісу, — спытаўся я ў краязнаўцы і пачуў пра яго планы даставіць на выбранае месца ўжо знойдзены прыгожы вялікі валун. Ён паўстане каля сельсавета напамінам пра тое, што тут праходзіла вузкакалейка, пракладзеная камунарамі — першымі пакарыцелямі палескіх балот.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара**

# ГОРКАЯ ПАМЯЦЬ ШКЛЕНІКОВА





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У тыя часы на Мядзельшчыне было спалена 68 вёсак, — расказвае **старшыня Мядзельскага раённага Савета дэпутатаў Алег БАРОЎКА.** — Некаторых з іх спасціг лёс Хатыні. 3848 чалавек было забіта або спалена, каля трох тысяч жыхароў вывезена на прымусовыя работы ў Германію. Усё, несумненна, рабілася дзеля таго, каб зламаць галоўнае — дух народа, пасеяць страх, хоць гэтым як-небудзь прымусіць паважаць або баяцца новую ўладу. Да вызвалення заставаўся няпоўны год. Але нават такімі жорсткімі дзеяннямі ворагу не дадзена было змяніць або адцягнуць свой цяжкі і ганебны гістарычны канец.

## ГАВОРАЦЬ СВЕДКІ...

У памяць пра забітых жыхароў у Шкленікове за савецкім часам паставілі помнік. Штогод, у гадавіну трагедыі, у вёсцы шматлюдна.

— Тут ляжыць мая спаленая бабуля, — змахваючы хустачкай слёзы, пачынае гаворку Уладзіслава Бярняк. — Чарняўскіх на помніку — шэсць чалавек. Напэўна, было данесена, што сын у партызанах. Калі вёску спалілі, дзядзька прыйшоў з Пількаўшчыны з сябрамі. Маці пазнаў па кавалачку світара... Сабраў костачкі і пахаваў. Калі назаўтра прыйшоў з сябрамі да нас (мы жылі за Мядзелам), размаўляць ужо не мог. За яго гаварылі таварышы... Развітаўся з маёй мамай і пайшоў на фронт. Загінуў пры вызваленні Польшчы.

У той дзень, калі палілі вёску, дзядулю Уладзіслава ўзялі ў абоз — разам з малодшай дачкой, якой і 15 гадоў не было, пагналі ў Германію. Але з Лынтупаў, куды прывязлі зняволеных, ён уцёк. «Абы яго адпусцілі, не ведаю, — удакладняе Уладзіслава Міхайлаўна. — Ён вярнуўся да нас. Два дні пабыў і пайшоў сюды, у Шкленікова, на папялішча. Трое сутак там прабыў, назад ужо дайсці не мог. Каля Мікульцаў падабраў дзядулю чалавек і прывёз на кані. Тры дні дзед гарэў у тэмпературы, затым памёр. Відаць, не мог перажыць убачанага».

Таццяне Чарняўскай, якая дагэтуль жыве ў Шкленікове, калі палілі родную вёску, было ўсяго тры гады. «Малая была, мала што помню, — прызнаецца жанчына. — Нас з братам і маму павезлі ў Германію. Бацькі ў хаце тады не было, варожая куля знайшла яго ў 1945-м».



Апошнія жыхары вёскі, што зведала пакуты.

Неўзабаве, восенню, на радзіму вярнуліся і яны.

— Прыйшлі ў вёску, а тут — ні кала, ні двара, — узгадвае жыхарка Шкленікова. — Зямляначку недалёка зрабілі, некаторы час так і жылі. А потым нейкую хатку зляпілі. Цяпер я адна засталася. Брат ужо сем гадоў як памёр.

На гадавіну трагедыі роднай вёскі 83-гадовы Эдвард Чарняўскі прыехаў з Вільнюса, дзе жыве ўжо шмат гадоў. Спыніўся ў бацькоўскай хаце — той, якую адбудавалі ўжо пасля вайны. Першая хата, а таксама ўсё, што там было, згарэла ў той ракавы дзень. У полымя цудам не трапіў і Эдвард.

— Калі да нас у вёску першы раз прыехалі немцы, усе сышлі на балота, — расказвае сведка тых падзей. — Гэта было тыдні за два, як яе палілі. Мы сядзелі ў лесе, і знайшоўся чалавек, які прывёў да нас немца. Нас усіх вывелі на лясную сцежку і выставілі ў рад. З двух бакоў стаялі кулямёты. Ніхто не сумняваўся: зараз расстраляюць. Але, відаць, нешта пайшло не так, і нас адпусцілі.

Другі раз пашанцавала менш. Усю ноч гітлераўцы бясчынствавалі, а раніцай вывелі жыхароў у сярэдзіну вёскі. «І тут зрабілі сартаванне: працаздольных, з малой колькасцю дзяцей (адзін ці два) — у адно месца, старых і нямоглых — у іншае, — узгадвае Эдвард Станіслававіч. — Апошніх завялі ў хату з саламяным дахам, гітлераўцы паднеслі факел — дом успыхнуў як запалка. Мы ішлі і ўсё гэта бачылі. На нашых вачах знішчалі родную вёску, а мы нічога не маглі зрабіць...»

У Германію сям'я Эдварда не трапіла. У касцёле ў Лынтупах, дзе асуджаныя на катаржныя работы чакалі наступных указанняў, ноччу ім нехта адчыніў дзверы. Пакінуць будынак адважыліся самыя смелыя.

Вестка пра тое, што ў суседняй вёсцы здарылася трагедыя да недалёкай адсюль Наўрані далецела імгненна. Жыхары суседняй вёскі баяліся, што іх напаткае такі ж лёс. Неяк абышлося...

Зінаіда Малько трапіла ў Шкленікова ў 1961 годзе: адсюль быў муж. Яго сям'і, дарэчы, таксама пашчасціла. У той дзень, калі палілі вёску, свякроўка хавалася з дзецьмі ў лесе, свёкра забралі ў Германію. Пасля вярнуўся.

Гэтыя пасівелыя жанчыны — апошнія жыхары вёскі, што зведала пакуты. У кожнай з іх — свой клопат: куры, козы, калі-нікалі прыязджаюць дзеці. Але ёсць тое, што іх аб'ядноўвае. Яны могуць не памятаць, што рабілі ўчора, а часам з цяжкасцю ўзгадваюць імёны праўнукаў. Затое ніколі не выкрасліць з памяці той вераснёўскі дзень 1943 года...

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

*Мядзельскі раён.*

***Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by.***

*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча.*

# З МАЛІТВАЙ АБ МІРЫ

Напэўна, шмат хто з нас зведваў пачуццё гонару, калі на нядаўнім прэстыжным Венецыянскім кінафестывалі пераможна прагучала імя нашага славутага земляка. Адрэстаўраваная на «Масфільме» кінастужка па сцэнарыі Алеся Адамовіча і Элема Клімава «Ідзі і глядзі» стала лепшай у конкурсе «Венецыянская класіка», вытрымаўшы канкурэнцыю сярод твораў сусветна вядомых мэтраў кіно Бернарда Берталучы і Стывена Спілберга.

Упершыню фільм выйшаў на экраны ў 1985 годзе і хутка абышоў увесь свет, выклікаўшы вялікі рэзананс. Стужка атрымала першую прэмію і «Залаты прыз» на XIV Маскоўскім кінафестывалі. Яе праглядзелі дзясяткі мільёнаў гледачоў. Такое пра вайну тады яшчэ ніхто не казаў. Цяпер фільм зноў нагадаў пра крохкасць свету. Пра трагедыю мірных жыхароў, у тым ліку з вёскі Боркі Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Аповесць «Карнікі», дзе Адамовіч пра гэта напісаў, лягла ў аснову экранізаванай ваеннай драмы. Таленавіты расійскі рэжысёр з шырокай душой і вялікім сэрцам Элем Клімаў моцна прасякнуўся творчасцю Адамовіча. Здымкі фільма «Ідзі і глядзі» ішлі цяжка і марудна, карціна атрымлівалася занадта жорсткай, і Клімаў неяк песімістычна выказаўся, што яе, напэўна, ніхто і глядзець не будзе. На што Адамовіч адказаў: «Хай не глядзяць. Але мы павінны пакінуць гэтую інфармацыю перад тым, як сыдзем на той свет. Пакінуць яе як сведчанне вайны, як маленне аб міры»...

У пачатку верасня мы адзначылі 90-годдзе пісьменніка. Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Бабруйскага раёна на працягу года правяла шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных яго творчасці, сумесна з супрацоўнікамі «Бабруйсккіно» знаёміла школьнікаў з літаратурнай спадчынай Адамовіча. У верасні сельскія бібліятэкі раёна запрасілі чытачоў на літаратурныя часы ў гонар юбіляра.

Душэўнай і цёплай атрымалася сустрэча дачкі пісьменніка Наталлі з мясцовым насельніцтвам 3 верасня ў Бабруйскай раённай бібліятэцы. Гучалі ўспаміны, дэманстраваліся ўрыўкі з «адамовіцкіх» кінастужак — дзве з паловай гадзіны праляцелі як адна хвіліна.

А перад гэтым было святкаванне юбілею ў Глушы, наведванне магілы Адамовіча з ускладаннем кветак, памятны вечар у пасялковым Доме культуры. Прыемнай нечаканасцю для Наталлі стала навіна пра тое, што жыхарка пасёлка Валянціна Філіповіч перадала ў сельсавет кніжку Алеся Адамовіча «Шлях да майстэрства: Станаўленне мастацкага стылю Кузьмы Чорнага» з дароўным надпісам — цудоўны экспанат для будучага музея. «Сябру дзяцінства Івану Стэфанавічу «Рыжаму» на добрую памяць», — напісана рукой Адамовіча на форзацы кнігі і пазначана дата — 4.10.58. Той, каму ён яе падарыў, вучыўся з будучым пісьменнікам у школе і нават сядзеў з ім за адной партай. На жаль, мужчына нядаўна памёр. А жонка вырашыла, што кніга зможа папоўніць экспазіцыю будучага музея. Наталля вельмі перажывала, што не паспела сустрэцца з сябрам бацькі і нават нічога не ведала пра яго.

Вядома, што лепшым сведчаннем нашай удзячнасці пісьменніку быў бы музей у Глушы, пра які «Звязда» піша ўжо не першы год. За гэты час быў адкрыты разліковы рахунак для дабрачынных ахвяраванняў пры Бабруйскім райвыканкаме, пры гэтай жа ўстанове сёлета створана Назіральная рада пад старшынствам **намесніка старшыні Бабруйскага райвыканкама Таццяны ВАРАНКО.** Падчас першага яе пасяджэння было прынятае рашэнне аб перадачы грошай на распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі. Пакуль агульнымі намаганнямі сабрана 11 800 рублёў, сума недастатковая для распрацоўкі праекта. Але абласны Цэнтр рэстаўрацыі пагаджаўся зрабіць яго на ўмовах спонсарства. На жаль, з верасня Цэнтр па рэстаўрацыі як самастойная арганізацыя ўжо не існуе, і пытанне з дакументацыяй зноў завісла.

У Бабруйскім райвыканкаме бачаць выйсце ў працягу збору грошай. Аднак рахунак з пачатку года, па словах **начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама Галіны ЧАРНОВАЙ,** не папаўняецца. І гэта, як запэўніла яна, нягледзячы на няспынную працу па папулярызацыі імя пісьменніка ўстановамі культуры раёна.

**Старшыня Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і член Назіральнай рады Антон АСТАПОВІЧ,** між тым, нагадвае, што без праектна-каштарыснай дакументацыі нельга разлічваць на сур'ёзныя спонсарскія грошы:

— Ёсць сістэма еўрапейскага фінансавання менавіта на рэстаўрацыю, стварэнне музеяў, але ж любыя еўрапейскія гранты можна ўзяць толькі тады, калі распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя, якая прайшла экспертызу.

Збор сродкаў працягваецца. А заадно і папулярызацыя твораў пісьменніка. Нядаўна ў магілёўскім кінатэатры «Космас» двойчы прайшлі кінапаказы фільма «Ідзі і глядзі». А Магілёўская гарадская арганізацыя Таварыства беларускай мовы распрацавала і ўжо абкатала экскурсійны маршрут з наведваннем адамовіцкіх мясцін у Глушы: Магілёў—Багушоўка—Глуша—Завалочыцы—Старыя Дарогі—Слуцк. Больш як 20 чалавек пабывалі ў перадапошнія вераснёўскія дні ў Глушы, потым наведалі магілу пісьменніка. «Нязручна было толькі тое, што прыйшлося шукаць будынак аптэкі, на рэканструкцыю якога збіраюцца грошы, — паведаміў **старшыня арганізацыі Алег ДЗЬЯЧКОЎ.** — Было б прасцей, калі б насупраць дома і на павароце на могілкі стаялі паказальнікі».



**Наталля АДАМОВІЧ на фотавыставе, прысвечанай здымкам фільма «Ідзі і глядзі», у Магілёўскай абласной бібліятэцы, 2016 год.**

Арганізацыя збіраецца распрацаваць буклет і раздаць яго па магілёўскіх турфірмах. Трэба, каб людзі ведалі, што ў іх ёсць яшчэ адна нагода для гонару за сваю Радзіму.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

Нагадваем, што дабрачынны рахунак для збору сродкаў на рэканструкцыю будынка пад музей Алеся Адамовіча адкрыты пры **аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама:**

**р/р 3642129272326 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», код 760 г. Бабруйск, УНП 701226324.** Прызначэнне плацяжу **«Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча».** Увага! **Указанне назначэння плацяжу прынцыповае! Гэты доўгі сказ абавязкова павінен быць пазначаны на банкаўскім дакуменце.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует**

В извещение о проведении повторного открытого аукциона (24.10.2017 г.) по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», опубликованном в газете «Звязда» от 05.10.2017, вносится изменение: **лот №8** – Контейнер офисно-бытовой, 2010 г. в., инвентарный №828 расположен по адресу: **г. Гродно, ул. Индустриальная, 2а**

| Контактные телефоны | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by. Сайт: www.cpo.by |
|---|---|

УНП 100120830


## ОАО «Амкодор-Унимод» (220073, г. Минск, ул. Пинская, 18)
## Оперативная информация о совершении сделки, в отношении которой имеется заинтересованность аффилированных лиц ОАО «Амкодор-Унимод»

– полное наименование и местонахождение акционерного общества:

**Открытое акционерное общество «Амкодор-Унимод»** 220073, г. Минск, ул. Пинская, 18,

– наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения о совершении сделки: **Совет директоров, 5 октября 2017 г.;**

– вид сделки: предоставление займа работнику Общества (члену Совета директоров) на строительство жилья;

– предмет сделки: заем на строительство жилья;

– критерии заинтересованности в соответствии с частью первой статьи 57 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах» лиц, указанных в абзацах втором–четвертом части седьмой статьи 57 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах»: отсутствуют;

– сумма сделки (общая сумма взаимосвязанных сделок): 60 тыс. бел. руб.;

– балансовая стоимость активов (стоимость активов), определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период, предшествующий дню принятия решения о совершении такой сделки (стоимости активов): 9182 тыс. бел. руб.

Совет директоров ОАО «Амкодор-Унимод»

УНП 100010116

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | Ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17/2 |
| **Продавец** | ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» 212008, г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17/2, тел. 8(0222)72-77-72 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, оборудование, расположенные по адресу:** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17

| № лота | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20%, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. с НДС 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 76 | **Полуприцеп Schmitz**, тентовый, низкорамный, г/п 28 т, 98 м. куб., 1998 г. в. | **5 040,00** | **252,00** |
| 2 | 106 | **Бытовка строительная** | **2 400,00** | **120,00** |
| 3 | 195 | **Кузов** (кунг) | **480,00** | **24,00** |
| 4 | **Объекты недвижимого имущества (составные части и принадлежности), расположенные по адресу:** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17, в составе: | | | |

| Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь |
|---|---|---|
| 700/С-3733 | **Здание цеха облицовочной плитки № 2 с административными помещениями (доля – 8/15)** (Здание многофункциональное) | 5 948,6 кв. м |
| 350/С-100401 | **Здание административного корпуса (доля – 1/5)** (Здание административного корпуса) | 1291,0 кв. м |

**Составные части и принадлежности:** кабельные линии внутри здания; автомат повторного включения 1600а апв-5; кабельные линии связи; пожарная сигнализация офиса; приточно-вытяжная вентиляция; сигнализация; система видеонаблюдения; система электроснабжения;
счетчики электроэнергии – 8 шт., видеонаблюдение склада; кран мостовой двухбалочный г/п 3,2 т; складское оборудование; стеллаж 1; стеллаж; сторожевая будка; металлическое ограждение с воротами и калиткой; ограждение площадки для производств.; ограждение площадки 1; ограждение площадки -2; площадка, прилегающая к цеху; пропускной пост; система пожарной сигнализации цеха; сторожевая будка 2; таль; стеллаж

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | объекты недвижимого имущества расположены на двух земельных участках: участок (для содержания и обслуживания здания цеха) площадью 0,8615 га (доля 21/50, право постоянного пользования), участок (для содержания и обслуживания здания административного корпуса) площадью 0,0440 га (доля 1/5, право аренды по 20.12.2021) |
| **Сведения об обременениях** | Арендаторы. Подробная информация по телефону +375(44)729-46-60, e-mail: jurist@sktzpt.by, Бураков Андрей Петрович |
| Начальная цена с НДС 20% | **1 128 730 руб. 80 коп.** |
| Шаг аукциона | **56 436 руб. 54 коп.** |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется с 8.00 до 18.00 во все дни недели по предварительному согласованию по тел. +375(29)631-19-51, Максим Александрович |

**Задаток: 2 000 (две тысячи)** белорусских рублей.
Перечисляется на р/с BY24 PJCB 3012 3008 8110 1000 0933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев код банка (БИК) PJCBBY2X. Получатель – ООО «СКТ ЗПТ», УНП 790104272. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ООО «СКТ ЗПТ», проводимом 18 октября 2017 г.

**Срок подписания договора купли-продажи**: не позднее 1 рабочего дня после проведения аукциона

**Срок оплаты**: в течение 3 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:**
аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина Республики Беларусь от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение о задатке. Информацию о документах, необходимых для участия в аукционе, порядке его проведения, оформления результатов вы можете получить по телефону +375 (44) 729-46-60, e-mail: jurist@sktzpt.by, Бураков Андрей Петрович.
В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 30.08.2017

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **18 октября 2017 г. в 12.00** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17, к. 2 офис ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **13 октября 2017 г. до 18.00** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17, к. 2 ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |
| **Контакты** | **+375(29)631-19-51, +375(44)729-46-60, +375(29)112-28-43, jurist@sktzpt.by** |

ДЭПАРТАМЕНТ ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ЗАВЕРАНА

МОСКВА МИНСК БАНК

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ двадцать первого, двадцать второго и двадцать третьего выпусков открытого акционерного общества «БАНК МОСКВА-МИНСК»

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента:**

полное:

на белорусском языке: Адкрытае акцыянернае таварыства «Банк Масква-Мінск»;

на русском языке: Открытое акционерное общество «Банк Москва-Минск»;

сокращенное:

на белорусском языке: ААТ «Банк Масква-Мінск»;

на русском языке: ОАО «Банк Москва-Минск».

**2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, д. 49, пом.1.

Телефон (+375 17) 239-17-00, факс (+375 17) 239-17-09.

Электронный адрес (e-mail): **mmb@mmbank.by**

**3. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность Банка, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии облигаций, и сроки их публикации**

Годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность Банка будет ежегодно публиковаться в газете «Звязда» в сроки, определенные законодательством Республики Беларусь, а также размещаться на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг.

В газете «Звязда» публикуется следующая информация:

– в случае принятия решения о реорганизации или ликвидации Банка – не позднее 2 месяцев с момента принятия такого решения;

– в случае возбуждения в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;

– в случае внесения изменений в проспект эмиссии облигаций – не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

Кроме того, данная информация будет размещена на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг в сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

Годовая индивидуальная финансовая отчетность Банка за 2016 год, а также отчетность о деятельности Банка по состоянию на 1 апреля 2017 года опубликована 18.04.2017 г. в газете «Звязда» №73 (28437), отчетность о деятельности Банка по состоянию на 1 июля 2017 года опубликована 21.07.2017 г. в газете «Звязда» №138 (28502).

**4. Размер уставного фонда Банка**

Уставный фонд Банка составляет 7 568 000 (Семь миллионов пятьсот шестьдесят восемь тысяч) белорусских рублей.

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарием эмитента является депозитарий ОАО «Банк Москва-Минск» (код депозитария – 025).

Место нахождения депозитария: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам: №02200/5200-124-1133. Составляющие работы и услуги: брокерская деятельность, дилерская деятельность, депозитарная деятельность.

**6. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Банк зарегистрирован постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 24 октября 2007 г. № 196 и осуществляет свою деятельность как правопреемник Унитарного предприятия «Иностранный банк «Москва-Минск», зарегистрированного постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 7 апреля 2000 г. № 9.2.

В Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (далее – «ЕГР») Банк зарегистрирован за №807000002.

Банк является преемником прав и обязанностей реорганизованного путем преобразования Унитарного предприятия «Иностранный банк «Москва-Минск» в соответствии с передаточным актом.

**7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций**

**7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о двадцать первом, двадцать втором и двадцать третьем выпусках облигаций принято Наблюдательным советом Банка 24 августа 2017 года (протокол №9).

**7.2. Форма и вид облигаций, объем выпуска, количество, номинальная стоимость облигаций**

| Номер выпуска | 21 | 22 | 23 |
|---|---|---|---|
| Валюта выпуска | Белорусский рубль | Белорусский рубль | Российский рубль |
| Форма и вид облигаций | Именные, процентные, неконвертируемые облигации, эмитируемые в бездокументарной форме в виде записей на счетах | | |
| Объем выпуска | 15 000 000 | 15 000 000 | 400 000 000 |
| Количество облигаций (шт.) | 150 | 150 | 400 |
| Номинальная стоимость облигации | 100 000 | 100 000 | 1 000 000 |
| Ставка процентного дохода, процентов годовых | 7 | 8 | 7,75 |

**7.3. Цель эмиссии облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций**

Эмиссия облигаций осуществляется в целях привлечения денежных средств юридических лиц для финансирования текущих (кредитных) операций Банка.

Средства, полученные от размещения облигаций, будут использованы в соответствии с целью их эмиссии.

**7.4. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Эмиссия облигаций осуществляется по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 08.09.2017 №372) в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 №277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» без учета положений, предусмотренных в подпункте 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь.

Общий размер обязательств по облигациям Банка не превышает нормативный капитал Банка, рассчитанный в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**7.5. Период проведения открытой продажи облигаций**

Продажа облигаций проводится с 2 октября 2017 года по 2 сентября 2018 года и прекращается в случае полной реализации всего объема выпуска.

**7.6. Срок и порядок обращения облигаций**

Срок обращения облигаций двадцать первого выпуска – 730 календарных дней.

Срок обращения облигаций двадцать второго и двадцать третьего выпусков – 365 календарных дней.

Для расчета срока обращения облигаций день начала размещения и день начала погашения считаются одним днем.

Обращение облигаций осуществляется среди юридических лиц резидентов и нерезидентов Республики Беларусь. Совершение сделок с облигациями при их размещении осуществляется в установленном законодательством Республики Беларусь порядке на организованном и неорганизованном рынках.

**7.7. Дата начала погашения облигаций**

Дата начала погашения облигаций двадцать первого выпуска – 02.10.2019.

Дата начала погашения облигаций двадцать второго и двадцать третьего выпусков – 02.10.2018.

Дата окончания погашения облигаций совпадает с датой начала погашения облигаций.

**7.8. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты, период начисления процентного дохода**

Годовая процентная ставка процентного дохода по облигациям двадцать первого выпуска устанавливается в размере **7%** годовых, по облигациям двадцать второго выпуска устанавливается в размере **8%** годовых, по облигациям двадцать третьего выпуска устанавливается в размере **7,75%** годовых.

Расчет процентного дохода по облигациям производится по каждой облигации путем его начисления на номинал одной облигации за соответствующий период начисления процентного дохода по установленной процентной ставке исходя из фактического количества дней в году (365/366) с округлением до одной копейки математическим методом.

Процентный доход по одной облигации рассчитывается по формуле:

$$\text{Д} = \frac{\text{Нп} \times \text{Пп}}{100} \times \left(\frac{\text{Т365}}{365} + \frac{\text{Т366}}{366}\right),$$

где:

Д – процентный доход, выплачиваемый периодически в течение срока обращения облигации;

Нп – номинальная стоимость облигации;

Пп – ставка дохода;

Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;

Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Продолжительность периодов начисления дохода, даты его выплаты и даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода приведены в Графиках выплаты процентного дохода:

по облигациям **двадцать первого** выпуска

| Номер периода начисления процентного дохода | Начало периода начисления процентного дохода | Конец периода начисления процентного дохода (дата выплаты процентного дохода/погашения) | Продолжительность периода начисления процентного дохода | Дата формирования реестра для целей выплаты процентного дохода либо погашения |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | 03.10.2017 | 31.10.2017 | 29 | 29.10.2017 |
| 2 | 01.11.2017 | 30.11.2017 | 30 | 28.11.2017 |
| 3 | 01.12.2017 | 31.12.2017 | 31 | 29.12.2017 |
| 4 | 01.01.2018 | 31.01.2018 | 31 | 29.01.2018 |
| 5 | 01.02.2018 | 28.02.2018 | 28 | 26.02.2018 |
| 6 | 01.03.2018 | 31.03.2018 | 31 | 29.03.2018 |
| 7 | 01.04.2018 | 30.04.2018 | 30 | 28.04.2018 |
| 8 | 01.05.2018 | 31.05.2018 | 31 | 29.05.2018 |
| 9 | 01.06.2018 | 30.06.2018 | 30 | 28.06.2018 |
| 10 | 01.07.2018 | 31.07.2018 | 31 | 29.07.2018 |
| 11 | 01.08.2018 | 31.08.2018 | 31 | 29.08.2018 |
| 12 | 01.09.2018 | 30.09.2018 | 30 | 28.09.2018 |
| 13 | 01.10.2018 | 31.10.2018 | 31 | 29.10.2018 |
| 14 | 01.11.2018 | 30.11.2018 | 30 | 28.11.2018 |
| 15 | 01.12.2018 | 31.12.2018 | 31 | 29.12.2018 |
| 16 | 01.01.2019 | 31.01.2019 | 31 | 29.01.2019 |
| 17 | 01.02.2019 | 28.02.2019 | 28 | 26.02.2019 |
| 18 | 01.03.2019 | 31.03.2019 | 31 | 29.03.2019 |
| 19 | 01.04.2019 | 30.04.2019 | 30 | 28.04.2019 |
| 20 | 01.05.2019 | 31.05.2019 | 31 | 29.05.2019 |
| 21 | 01.06.2019 | 30.06.2019 | 30 | 28.06.2019 |
| 22 | 01.07.2019 | 31.07.2019 | 31 | 29.07.2019 |
| 23 | 01.08.2019 | 31.08.2019 | 31 | 29.08.2019 |
| 24 | 01.09.2019 | 02.10.2019 | 32 | 30.09.2019 |
| Итого: | | | **730** | |

По облигациям **двадцать второго и двадцать третьего** выпусков

| Номер периода начисления процентного дохода | Начало периода начисления процентного дохода | Конец периода начисления процентного дохода (дата выплаты процентного дохода/погашения) | Продолжительность периода начисления процентного дохода | Дата формирования реестра для целей выплаты процентного дохода либо погашения |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | 03.10.2017 | 31.10.2017 | 29 | 29.10.2017 |
| 2 | 01.11.2017 | 30.11.2017 | 30 | 28.11.2017 |
| 3 | 01.12.2017 | 31.12.2017 | 31 | 29.12.2017 |
| 4 | 01.01.2018 | 31.01.2018 | 31 | 29.01.2018 |
| 5 | 01.02.2018 | 28.02.2018 | 28 | 26.02.2018 |
| 6 | 01.03.2018 | 31.03.2018 | 31 | 29.03.2018 |
| 7 | 01.04.2018 | 30.04.2018 | 30 | 28.04.2018 |
| 8 | 01.05.2018 | 31.05.2018 | 31 | 29.05.2018 |
| 9 | 01.06.2018 | 30.06.2018 | 30 | 28.06.2018 |
| 10 | 01.07.2018 | 31.07.2018 | 31 | 29.07.2018 |
| 11 | 01.08.2018 | 31.08.2018 | 31 | 29.08.2018 |
| 12 | 01.09.2018 | 02.10.2018 | 32 | 30.09.2018 |
| Итого: | | | **365** | |

**7.9. Дата и номер государственной регистрации облигаций**

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 04.10.2017.

Государственный регистрационный номер:

двадцать первого выпуска 5-200-02-3109;

двадцать второго выпуска 5-200-02-3110;

двадцать третьего выпуска 5-200-02-3111.

**8. Сведения о месте и времени ознакомления с Проспектом эмиссии облигаций**

С более подробной информацией (Проспектом эмиссии облигаций двадцать первого, двадцать второго и двадцать третьего выпусков) можно ознакомиться:

– в Центральном офисе эмитента по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, д. 49, пом. 1 ежедневно в рабочие дни с 9.00 до 16.30;

– на официальном сайте эмитента в глобальной компьютерной сети Интернет **(mmbank.by)**.

Председатель Правления ОАО «Банк Москва-Минск» — И. В. Лихогруд

Главный бухгалтер ОАО «Банк Москва-Минск» — А. В. Дорожкин

М.П.

■ Ёсць прапанова

# «А ПРА ЖАНЧЫН ДЫ ДЗЯЦЕЙ, ВЫХОДЗІЦЬ, ЗАБЫЛІСЯ?»

**...Меў трохі часу — перачытаў летнія нумары літаратурных часопісаў і вось што заўважыў. Некалі, у савецкія часы, усе яны да Дня Перамогі і вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў друкавалі загінулых у вайну паэтаў і пісьменнікаў, прапаноўвалі новыя творы жывых Пімена Панчанкі, Аляксея Пысіна, Пятра Глебкі, Максіма Танка, Васіля Быкава, Івана Мележа...**

Цяпер такога, можна сказаць, няма. Нават горш за тое: сталі выказвацца думкі, што пра вайну ўжо трэба забыцца.

Не ведаю, як на ваш, а на мой погляд заклікаць да гэтага можа толькі той, для каго вайна — нейкае абстрактнае паняцце, а не трагедыя, не вялікае гора, перажытае асабіста альбо тваімі роднымі — бацькамі, дзядамі... Тады і ты пра яе будзеш памятаць і рабіць усё, каб ніколі больш не пачалася новая, каб наш край не напаткала яшчэ адна дэмаграфічная катастрофа.

Што яшчэ для гэтага варта было б зрабіць?

Некалі даўно мне пашчасціла пазнаёміцца з народным мастаком Беларусі Іванам Ахрэмчыкам і пачуць ад яго, што ў Мінску, на рагу вуліц Беларускай і Ульянаўскай, добра было б пабудаваць капліцку ў памяць усіх нашых загінулых жанчын і іх дзетак.

Ну сапраўды, знайшлі ж мы сродкі, каб ушанаваць памяць хлопцаў, якія загінулі ў Афганістане,— ходзяць людзі на вострау слёз.

Вайна ў нас чамусьці асацыюецца з ахвярамі-мужчынамі, якія загінулі ў баях. А пра жанчын, якіх катавалі, пра дзяцей, выходзіць, забыліся?

**У. М. ГОЛУБЕЎ**, *г. Мінск*

■ Чалавек — чалавеку

# ПТУШКІ, ЯК ЛЮДЗІ...

**Некалі даўно буслы перамаглі майго суседа: як ён ні адпуджваў, — змайстравалі на слупе гняздо. І цяпер штогод мы маем магчымасць чакаць сваіх птушак, любавацца імі, лічыць галоўкі бусляняг і за іх хвалявацца, бо леты бываць розныя, і вялікую сям'ю ў засуху цяжка пракарміць.**

Але ж найцяжэй буслам было сёлета, бо неяк раніцай здарылася непапраўнае: суседскі сабака злавіў бусліху, асірацў траіх буслянят.

Бацька-бусел вельмі перажываў гэту страту, доўга сядзеў побач з буслянкаю, пазіраў на малых. Але ж потым, дзякаваць богу, нідзе не дзеўся — стаў насіць ім ежу.

Хапала яе, не хапала, — бусляняты раслі на вачах і хутка ўжо сталі спрабаваць свае крылы...

Хочацца верыць, што яны — як бы высока ні ўзляцелі — будуць памятаць свайго бацьку, які не пакінуў іх у бядзе, паставіў на крыло. Хоць мог бы (на жаль, як іншыя людзі) і ўцячы ад сваіх дзяцей, абы не гадаваць.

**Анатоль КАШЭВІЧ**, *Лельчыцкі раён*

■ Так ці не?

# І не будзе падстаў для сумненняў

**«У нашай мове ёсць шэраг досыць падобных слоў. Патлумачце, калі ласка, чым, напрыклад, *вывад* адрозніваецца ад *высновы* і *выніку*, а *стан* — ад *становішча*? І яшчэ. Я разумею, што словы *нагода* і *падстава* вельмі блізкія сваім сэнсам. Але ж розніца, відавочна, ёсць. У чым яна?» — цікавіцца па электроннай пошце спадарыня Кацярына М.**

На пытанні чытачкі адказваюць **стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.**

1. *Вывадам* называюць пэўную думку, меркаванне, да якога нехта прыйшоў у сваіх разважаннях. Ён, *вывад*, згадзіцеся, можа быць лагічным, правільным, няправільным, паспешлівым...

У гэтым самым значэнні ўжываецца і слова *выснова.* Таму зрабіць *выснову* значыць тое, што і зрабіць вывад.

Дарэчы, у гэтых двух назоўнікаў у літаратурнай мове ёсць і трэці сінонім — *заключэнне.*

Слова ж *вынік* не з гэтага шэрагу: ім, *вынікам*, называюць тое, што атрымалася, з'явілася пасля нейкага дзеяння. Можна сказаць, напрыклад, што вынікам працы пісьменніка стала папулярнасць многіх кніг, вынікам працы агранома — добры ўраджай бульбы.

Да гэтага слова сінонімам выступае і назоўнік *рэзультат*. Аднак сёння ён ужываецца ўсё радзей і радзей, бо ў плане значэння нічым не адрозніваецца ад выніку і можа быць заменены ім ва ўсіх выпадках.

2. Сінонімы *стан* і *становішча* сапраўды маюць пэўнае разыходжанне, праз якое, ведаючы, іх даволі проста адрозніць. Запомнім, што другое слова семантычна звязана ў першую чаргу з месцам, з прасторай. Выраз сацыяльнае *становішча* кажа, напрыклад, пра тое «месца», якое чалавек займае ў соцыуме, яго 'ролю ў грамадстве'.

*Стан* жа мае на ўвазе ў першую чаргу ўнутраныя ўмовы, акалічнасці існавання чаго-небудзь. Выраз «эканамічны стан краіны» можна растлумачыць, напрыклад, як эканамічныя ўмовы, якія ў краіне склаліся.

3. Што да *нагоды*, то ёй можа быць нейкая падзея, якая становіцца прычынай для таго, каб адбылася іншая. Напрыклад, дзень нараджэння некага з сямейнікаў можа паслужыць *нагодай* для таго, каб сабрацца ўсёй радні. Альбо перамога спевака ў конкурсе можа паслужыць *нагодай* для яго прэс-канферэнцыі.

Слова *нагода* можа абазначаць таксама зручны выпадак.

А вось *падставу* не абавязкова «звязваць» з нейкай падзеяй, яна — прычына для чаго-небудзь альбо любыя абставіны, якія з'яўляюцца асновай для нейкіх дзеянняў. Можна казаць, напрыклад, што для прызнання кагосьці вінаватым не было законных падстаў, альбо веданне мовы не давала падстаў для сумненняў — у прыватнасці, дзе якое слова трэба ўжыць...

**У абарону слоў**

Сёння мы баронім слова *жабры.*

Апошнім часам усё часцей і часцей гучыць меркаванне, што гэтае слова — русізм, што па-беларуску трэба казаць і пісаць *шчэлепы*. Звернемся да аўтарытэтаў: прааналізаваўшы розныя тэксты і слоўнікавыя матэрыялы, мовазнавец Іван Якаўлевіч Лепешаў у кнізе «Культура маўлення» прыходзіць да высновы, што *шчэлепамі* называлі і называюць якраз не *жабры*, а *сківіцы*, як у людзей, так і жывёл. *Жабры* ж (а таксама выраз «браць (узяць) за жабры») ёсць ва ўсіх слоўніках. Таму раздзяляйма розныя словы — жабры і шчэлепы!

■ Пісьмо з каментарыем

# «БЕЛАРУСАМ» РАБОТЫ Ў ГОРАДЗЕ ЯШЧЭ ХОПІЦЬ

**Рэдакцыя «Звязды» атрымала ліст ад мінчаніна Уладзіміра Салаўя, які эмацыянальна абураецца тым, што ў Мінску вуліцы прыбіраюць прапашнымі трактарамі. Вось што, у прыватнасці, піша заяўнік. «Трэці год вяду актыўныя дзеянні. Прашу замяніць трактары з прычэпамі і шчоткамі, якія зусім не дадаюць прыгажосці нашаму гораду, на адпаведную ўзроўню горада-героя, эстэтычна вытрыманую тэхніку для ўборкі. Кожны дзень мы назіраем прапашныя трактары на праспектах і плошчах горада. Ну, ніяк яны не ўпісваюцца ў пейзаж сталіцы. Ім самае месца ў полі. Лічу, што гэта нават непавага ўлад да жыхароў. Тым самым яны і пацвярджаюць, што краіна названа ў гонар трактара».**

Ну, апошняе выказванне пакінем на сумленні аўтара. А вось тое, што, дзякуючы ў тым ліку і трактарам «Беларус», пра нашу краіну больш даведаліся ў свеце, — факт. Напрыклад, калі не памыляюся, яшчэ ў савецкія часы ў В'етнаме была выпушчана паштовая марка з выявай аднай з мадэляў тэхнікі вытворчасці Мінскага трактарнага завода. Але гэта лірычнае адступленне.

Трактары, пра якія згадвае заяўнік, — шматфункцыянальная тэхніка. На іх не толькі араць, як піша гараджанін, можна, але і з адвалам, шчоткай выкарыстоўваць, прычэп ці цыстэрну перавезці. Дарэчы, і ў межах горада можа ўзнікнуць патрэба нешта ўзараць. Дык тады што, гораду, які не мае такой уласнай тэхнікі, выпісваць трактары з плугамі аднекуль? Ці мець толькі для такіх выпадкаў спецыялізаваную, якая ў іншы час будзе прастойваць? Тым больш, што ніхто магутнымі энерганасычанымі трактарамі вуліцы не падмятае. З іншага боку было б дзіўна, маючы ў сталіцы знакаміты завод, не выкарыстоўваць у самім горадзе яго прадукцыю, так?

Пра знешні выгляд трактароў таксама не зусім зразумелае выказванне заяўніка — за апошні час дызайн іх змяніўся, былі выпушчаны новыя сучасныя мадэлі. Дэманстрацыю дасягненняў трактарабудаўнікоў, у тым ліку падчас святкавання Дня горада, усе бачылі? Якая там была прадстаўлена лінейка навінак? Калі гэтага заяўніку недастаткова, прывядзём афіцыйны адказ на яго запыт з дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама».

«Канструктарскімі бюро ААТ «МТЗ», ААТ «Амкадор», ААТ «МАЗ» і іншымі беларускімі вытворцамі вядзецца вялікая работа па стварэнні зусім новых лінеек сучасных камунальных машын, якія не саступаюць, а часам і пераўзыходзяць імпартныя аналагі па тэхнічных характарыстыках, дызайне, якія маюць перавагу і ў цэнавым пакзчыку.

Так, напрыклад, ДНУ «Аб'яднаны інстытут машынабудавання НАН Беларусі» распрацоўвае і асвойвае вытворчасць малагабарытнай камбінаванай камунальнай вакуумна падмятальна-ўборачнай і солеразмеркавальнай машыны для насычэння не толькі ўнутранага рынку айчыннай тэхнікай, але і для экспарту. ААТ «МАЗ» разам з кампаніямі КНР і еўрапейскімі вытворцамі пачалі выпуск пробных экзэмпляраў вакуумна-падмятальных машын. Праведзены выпрабаванні на вуліцах Мінска, і аўтамабілі зарэкамендавалі сябе з найлепшага боку як у плане высокіх тэхнічных характарыстык і надзейнасці, так і ў сучасных дызайнерскіх рашэннях.

Прадпрыемствамі краіны пастаянна вядуцца работы па ўдасканаленні тэхнікі, якая выпрацоўваецца з выкарыстаннем інавацыйных тэхналогій, што адпавядаюць усім сучасным патрабаванням. Гэта дасягаецца за кошт стварэння комплексу новых тэхнічных рашэнняў, якія забяспечваюць высокія пакзчыкі канкурэнтаздольнасці тэхнікі (прыцягальнасць, сучасны перспектыўны дызайн, высокія эксплуатацыйныя характарыстыкі, высокая тэхналагічнасць пры вытворчасці і ў эксплуатацыі, надзейнасць і экалагічнасць), што ў сваю чаргу ў кароткія тэрміны дазволіць забяспечыць не толькі ўнутраны рынак, але і расшырыць экспартны патэнцыял прамысловага комплексу Беларусі».

Як бачна з адказу, у плане стварэння новых камунальных машын робіцца шмат. Дык супраць чаго заяўнік тры гады «вядзе актыўныя дзеянні»? Не трэба быць спецыялістам, проста падключыўшы элементарную логіку: зразумела, што замяніць у адзін момант увесь парк такой камунальнай тэхнікі ў горадзе немагчыма. Ды і ці трэба так рабіць, калі раней набытыя трактары яшчэ могуць эксплуатавацца? І ці так яны неэстэтычна выглядаюць, як пра тое даводзіць мінчанін? Так што, думаецца, «Беларусам» работы на найбліжэйшы час у горадзе хопіць. Пра гэта, у прынцыпе, і пішацца далей у адказе на запыт заяўніка: «ДВА «Гарраматўадар Мінгарвыканкама» неаднаразова адказваў на звароты вашага чытача аб мэтазгоднасці выкарыстання трактарнай тэхнікі пры ўтрыманні вулічна-дарожнай сеткі Мінска».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*



■ Добрыя навіны

# ХРАМ ПРЫ ДАРОЗЕ

**Некалі дарога Столін—Пінск ішла па пясках праз Плотніцу і адбірала аж тры гадзіны. Пасажырам, у прыватнасці, не раз даводзілася выходзіць з аўтобуса і падпіхваць яго...**

Потым, калі новая дарога прайшла паўз Фядоры, і шлях да Пінска скараціўся ўдвая, стала зразумелай назва мясцовага калгаса — «Прагрэс». На цэнтральнай сядзібе яго з'явіліся новыя адміністрацыйныя і жылыя будынкі, школа, дзіцячы садок, Дом культуры з вялікай актавай залай, радавалі вочы амаль гарадская лазня і крама...

А цяпер намаганнямі вернікаў узведзены і праваслаўны храм — самы прыгожы, бадай, у нашым раёне!.. Прычым сакрэт гэтай прыгажосці не столькі ў вышыні яго сцен і пазалоце купалаў, колькі ў духоўным святле, якое ён выпраменьвае. Яго аздабленне, інтэр'ер, іконы, вітражы, спевы царкоўнага хору, крыжы, адзенне святара не могуць не ўражваць! А калі ведаць, што да ўсяго прыкладалася рука твайго бацькі ці дзеда, калі ты сам браў удзел у стварэнні гэтай прыгажосці, хіба знойдзецца месца раднейшае?

**Уладзімір ЖЫЛЕВІЧ**, *г. Столін*

■ Віншуем!

## ЧАРОЎНАЕ СВЯТЛО МУЗЫКІ

Чаму варта завітаць на юбілейны канцэрт Аляксандра Анісімава?



**Заўтра, 8 кастрычніка, адзначае свой 70-гадовы юбілей галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі Аляксандр АНІСІМАЎ. Сёння маэстра Анісімаў — адзін з самых запатрабаваных дырыжораў Беларусі і Расіі. Найчасцей яго можна бачыць на сцэне Белдзяржфілармоніі. Аднак ён — жаданы госць сімфанічных аркестраў і тэатраў Еўропы, Азіі і Амерыкі.**

Дырыжыраваннем Анісімаў займаецца ўжо больш за 50 гадоў. Кожная яго праграма — гэта дэталёва прадуманая і ўмела зрэжысіраваная музычная акцыя, з пэўным сюрпрызам, прэм'ерай, нечаканым паваротам. Дырыжор выкарыстоўвае партытуры сучасных беларускіх аўтараў, адкрывае публіцы новыя імёны салістаў.

Асабліва цікавыя праграмы класічнай музыкі, якія рэдка выконваліся ці зусім невядомыя ў Мінску: Гія Канчэлі, Дзмітрыя Шастаковіча, Сяргея Пракоф'ева, Бэла Бартака, Рыхарда Штрауса, Аляксандра Цамлінскага, Рыхарда Вагнера, Іагана Себасцьяна Баха, Фрыдрыха Гендэля.

У гонар свайго юбілею Аляксандр Анісімаў 26 кастрычніка будзе ладзіць святочны канцэрт у філармоніі. Для гэтай дзеі маэстра абраў сачыненне, пра якое ў архівах філармоніі няма дакладных звестак: ці выконвалася яно ў Мінску. Ва ўсякім разе, апошнія 40 гадоў — не. Гэта «Урачыстая меса» Людвіга ван Бетховена. Грандыёзная работа на 120 хвілін, якая ўяўляе сабой адзін з самых папулярных твораў сусветнага рэпертуару класікі.

«Меса» ставіць перад выканаўцамі — аркестрам, хорам, салістамі, арганістам, дырыжорам — вельмі складаныя задачы, што і ўзмацняе інтрыгу гэтага вечара. Можна быць упэўненым, што гасцей канцэрта чакае яшчэ адно зусім неверагоднае музычнае адкрыццё. І ўсе, хто ў гэты вечар выйдзе на сцэну, будуць несці ў залу энергію шэдэўра, чароўнае святло музыкі.

У канцэрце 26 кастрычніка возьмуць удзел капэла імя Шырмы, салісты — Ірына Крыкунова (Расія), Святлана Шылава (Вялікі тэатр, Расія), Герхард Шульц (Германія), Іван Кузьмін-Караваеў («Новая опера», Расія), арганіст — прафесар Ігар Алоўнікаў і, вядома ж, юбіляр — маэстра Аляксандр Анісімаў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Забытыя традыцыі

## ВАЛЬС, БЛЯСК І РАСКОША

Пачынаць рыхтавацца да балю ў Вялікім тэатры оперы і балета трэба ўжо ў кастрычніку

**Неяк я трапіла на сапраўдны баль у сапраўдным замку — на сёння ўжо архаічная, але прыгожая традыцыя дзенідзе яшчэ захоўваецца. Праўда, у атачэнні інтэр'ера з ляпнінай, выкшталцоных жырандоляў і прыгожых строяў аказалася, што я не ўмею танцаваць вальс. Мяне запрасіў на танец прадстаўнічы, станісты пан і сказаў: «Не хвалюйцеся — я павяду, і ўсё атрымаецца»...**

Скончылася гэта яго рэплікай «Ну ў вас і характар», і ўсе іншыя спробы мяне «павесці» сталіся фіяска. У ноч з 13 на 14 студзеня — на стары Новы год — у Вялікім тэатры оперы і балета пройдзе традыцыйны, ужо дзявяты, Вялікі навагодні баль. І, на шчасце, тут жа, у тэатры, на адмысловых уроках да гэтага балю можна падрыхтавацца. Каб і весці ў вальсе, і каб цябе вялі правільна.

Тэатр ужо абвясціў продаж квіткоў, а квіток аўтаматычна дае права наведваць урокі танцаў: сёлета іх зноў будзе весці заслужаная артыстка Беларусі, балетмайстар-рэпетытар Вялікага тэатра Юлія Дзятко. Заняткі пачнуцца ўжо ў канцы кастрычніка, і прымуць як дэбютантаў, так і карыфеяў.

Баль, такім чынам, — доўгайграючая справа, прынамсі, пачынаць рыхтавацца да яго варта ўжо са старту заняткаў, 23 кастрычніка. Урокі танцаў займаюць амаль тры месяцы, за гэты час трэба прыдумаць убранне (дрэс-код строгі: жанчыны павінны прыйсці ў бальнай альбо вечаровай доўгай сукенцы, а мужчыны — у смокінгу альбо ў элегантным касцюме), падрыхтавацца ў веданні этыкету і нарэшце прыехаць.

Тэатр оперы і балета, у сваю чаргу, абяцае адпаведную атмасферу, сустрэчу з артыстамі Вялікага, з якімі можна кантактаваць наўпрост, а не толькі бачыць іх на сцэне; канцэрт, розыгрышы, прыгажосць, бляск, розныя нечаканасці і шампанскае.

Інтэр'ер Вялікага, як і яго статус «храма» (прабачце за пафас) класічнага мастацтва, зайздросная публіка (тут збіраюцца артысты, музыкі, рэжысёры) — натуральнае асяроддзе для мерапрыемства кшталту балю. Святкаванне старога Новага года ў Вялікім тэатры оперы і балета ў такой незвычайнай для XXI стагоддзя форме стала добрай традыцыяй і прыцягвае як заўсёднікаў, так і навічкоў.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

■ Фестываль

**Яўген МІРОНАЎ:**

# «...ЦІ ІГРАЎ НЕШТА БОЛЬШ СКЛАДАНАЕ?»

**Тэатр Нацый прадставіў у Мінску спектакль «Іванаў» паводле Чэхава: зорная трупа і адзіны паказ у рамках «ТЭАРТу» выклікалі ажыятаж. Ішлі паглядзець на народнага артыста Расіі Яўгена Міронава, якога ў Мінску — у «Вішнёвым садзе» Эймунтаса Някрошуса — бачылі ўжо даўно. А на адмысловай сустрэчы ён ужо як мастацкі кіраўнік Тэатра Нацый прадставіў трупу адзначанага «Залатой Маскай» «Іванава», пастаўленага Цімафеем Кулябіным, і распавёў, як ішла работа над спектаклем.**

### ПРА ІВАНАВА:

— Мы невыпадкова звярнуліся да «Іванава»: яго прэм'ера некалі адбылася ў будынку Тэатра Нацый, у якім мы цяпер працуем. Тады Чэхаў быў яшчэ маладым драматургам-пачаткоўцам, а саму пастаноўку ўспрынялі неадназначна. Новай камандзе Тэатра Нацый спатрэбілася дзесяць гадоў, каб паставіць «Іванава», што зрабіў Цімафей Кулябін.

Напачатку мы паехалі ў сядзібу Чэхава ў Мелехава: гэтааднапавярховы дамок. Я не разумею, як гэта магло быць: Чэхаў і вялікая колькасць людзей, што заўсёды жылі побач з ім: сваякі, сваты, прыжывалкі, якія начавалі на куфрах... А ў яго — маленькі кабінецік. Гэта ніяк не стасавалася з маімі ўражаннямі ад спектакляў «Іванаў», якія я бачыў дагэтуль. Напрыклад, эпізод, калі Іванаў гучна крычыць: «Сара, зачыні акно, табе шкодна стаяць на свежым паветры!» стварае ўражанне вялікай прасторы. А насамрэч усё было шчыльна: фактычна камунальная кватэра...

Гэта да пытання пра тое, што такое ігра ў класіку сёння: усё знаёмае. Знаёмая цесната, у якой пакутуе чалавек. Для мяне прататыпам Іванава стаў сам Антон Паўлавіч, яшчэ малады чалавек, які цягнуў воз сям'і, быў яе кармільцам. Нездарма яго цікавілі філасофскія тэмы пра сэнс існавання: ці так усё выбудавана ў свеце, як трэба? Нам важна было вызначыцца, хто такая Сара, чым яна займалася да таго, як захварэла. Мы імкнуліся раскласці ўсё на зразумелыя нам рэчы, у тым ліку, колькі ён вінен. Таму што пытанне грошай — ужо ў першых радках п'есы.

Наогул Івановых — шмат, а Іванаў для мяне — адзін. Людзей, якія ўваходзяць у такія стасункі са сваім сумленнем, я не ведаю. Магчыма, Салжаніцын. Але я гэта для сябе так вызначаю, бо не зусім правільная аналогія: у Салжаніцына была ідэя, а ў Іванава няма ідэі, ён проста не згодны — са светам, з самім сабой, са светам унутры сябе. Гэта катаванне для тых, хто побач, катаванне для самога сябе, але ён чэсны ў гэтым, ідзе да канца ў сваёй бескампраміснасці.

Я не ведаю, ці іграў нешта больш складанае ў жыцці. Кожны спектакль на супрацьлленне — мае асабістае. Таму што я кампрамісны чалавек у дачыненні да жыцця. І кожны раз шукаю абгрунтаванне, чаму я — Іванаў — паступаю так жорстка. Ідзе барацьба з самім сабой. І кансэнсусу не будзе ніколі: да такой пакуты ў гэтай ролі я сябе прысудзіў.

### ПРА РЭПЕРТУАР:

— Рэпертуарная палітыка зыходзіць з першапачатковай ідэалогіі Тэатра Нацый: гэта адкрытая пляцоўка без трупы. Ёсць яшчэ адзін такі тэатр — «Практыка». Але ў адрозненне ад яго Тэатр Нацый, хоць і без трупы, мае вялікую каманду. Кожны рэжысёр можа прыйсці са сваёй камандай, што часта ў нас і бывае: артысты, мастакі, сцэнографы ажыццяўляюць свае мары. Мы пайшлі далей: апроч вялікай сцэны, адкрылі малую. Вялікая сцэна прадугледжвае запаўненне залы — усё ж я спешчаны



Што датычыцца пераваг гэтага сэрвісу, то эканомія — як для кіроўцы, так і для спадарожнікаў — немалая. Бо тут ты плаціш менавіта за паліва, а не за паслугі перавозкі. Але варта зрабіць агаворку: кіроўцы самі прызначаюць цану за паездку, таму падман з іх боку не выключаны. Яшчэ адна перавага заключаецца ў тым, што меншая колькасць аўтамабіляў на дарогах значна зніжае трафік, а гэта вялікі плюс для горада. Найважнейшы аспект карпулінгу — памяншэнне аўтамабільных выкідаў. Іншымі словамі, карыстальнікі карпулінгу не толькі эканомяць, але клапоцяцца пра экалогію.


Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

Вядома, ёсць і мінусы, прычым немалыя. Па-першае, большасць аўтавытворцаў не падтрымлівае падобныя сэрвісы: для іх лепш, каб кожны купіў сабе аўтамабіль, а не дзяліў адзін з іншымі. Вядома, не ўхваляюць гэта і таксаматорныя арганізацыі, бо, па сутнасці, іх функцыі выконваюць звычайныя людзі, якія не плацяць за падобную дзейнасць падаткі. Ёсць мінусы і для саміх карыстальнікаў: аўтамабіль можа трапіць у аварыю, што затрымае час паездкі. Акрамя таго, часам кіроўцу трэба заязджаць за спадарожнікамі, а гэта таксама адымае час. Магчыма, самая вялікая праблема, якая стрымлівае імклівы рост папулярнасці карпулінгу, — бяспека пасажыраў і кіроўцаў. Кіроўца можа задумаць нешта крымінальнага характару, таксама як і адзін з пасажыраў можа здзейсніць злачынства. Вядома, усё гэта толькі тэорыя. Як жа на практыцы працуе такая паслуга ў Беларусі?

## АЙЧЫННЫЯ РЭАЛІІ

Каб пачаць карыстацца гэтым сэрвісам у нашай краіне як у якасці кіроўцы, так і ў якасці пасажыра, дастаткова зарэгістравацца на адным з сайтаў у інтэрнэце. Большая іх частка — гэта сэрвісы, зарэгістраваныя ў Расіі, аднак і на іх даволі лёгка можна адшукаць маршруты на тэрыторыі нашай краіны. Усім удзельнікам, якія актыўна карыстаюцца такімі сайтамі, выстаўляецца ацэнка. Акрамя таго, многія пакідаюць каментарыі пра чалавека: як праявіў сябе ў паездцы, ці ўзнікалі праблемы. Гэта дазваляе быць упэўненым у выбары спадарожнікаў.

Існуе і айчынны сайт, прысвечаны карпулу, які быў запушчаны каля 5 гадоў таму, але, мяркуючы па ўсім, ён больш не працуе: зарэгістравацца не атрымліваецца, новыя маршруты не з'яўляюцца. А вось расійскія сайты сапраўды квітнеюць: па адным маршруце, напрыклад Мінск—Масква, выдае больш за 50 варыянтаў. У працэсе вывучэння варыянтаў для паездкі выяўляецца дзіўная рэч. Справа ў тым, што часцей за ўсё ў аўтамабілі — няхай гэта будзе седан, хэтчбэк або пазадарожнік — адно месца для вадзіцеля, а таксама тры — для пасажыраў. У рэдкіх выключэннях ёсць трэці рад сядзенняў, на якім худа-бедна змяшчаюцца дзеці, але дарослым у доўгай дарозе будзе нязручна. А сярод прапанаваных варыянтаў на тую ж Маскву фігуруе такая колькасць свабодных месцаў, як 7 або 8. У дэталях паездкі часам паказваюць марку і мадэль аўтамабіля. І, вядома, такую колькасць месцаў могуць дазволіць толькі мікрааўтобусы.

Пра што гэта сведчыць? Пра тое, што гэта, па сутнасці, звычайныя маршруткі. Напрыклад, у каментарыях да кіроўцы Данііла, які прапануе восем вольных месцаў, ёсць наступны водгук ад Аляксандра: «Нармальная паездка, толькі гэта прыватнае вознікцтва на маршрутцы, без папярэджання. Трэба пісаць пра гэта загадзя». На што кіроўца парыруе: «Гэта не прыватны развоз, і дакладна не на маршрутцы, гэта асабісты аўтамабіль, проста вялікі. Перад тым, як ехаць, цікаўцеся, на чым вы едзеце». Вядома, гэта цалкам можа быць і так, аднак варта быць асцярожным: да магчымага нелегала не прад'явіш прэтэнзіі за няякасную паездку.

Наколькі выгадна карыстацца такім сэрвісам? Цана самага таннага варыянта па маршруце Мінск—Масква — крыху больш за 30 беларускіх рублёў. Калі ехаць на цягніку, то плацкарт абыдзецца мінімум у 70 рублёў, калі абраць аўтобус, то можна знайсці варыянт за 45 рублёў. Выгадна? Сапраўды, так.

Адлегласць ад Мінска да Брэста можна пераадолець за 15 беларускіх рублёў. Па гэтым маршруце можна дабрацца за 5 беларускіх рублёў у агульным вагоне цягніка, але час у шляху складзе чатыры з паловай гадзіны. Квіток на аўтобус — ад 13 рублёў, з прыпынкамі гэта таксама адбярэ больш часу.

А калі ўзяць, скажам, зусім невялікія адлегласці? Ад Мінск да Барысава — крыху больш за 60 кіламетраў. На сайтах карпулу можна знайсці варыянты ўсяго за 3 беларускія рублі. На аўтобусе ці маршрутцы — каля 4 рублёў, на цягніку — ад паўтара рубля. Увогуле, цалкам супастаўныя сумы.

## АСАБІСТЫ ВОПЫТ

Вядома, лепш за ўсё пра карпул могуць расказаць самі карыстальнікі. **Менеджар ЕРАМ Вольга КАЗЛОВА** здзейсніла дзве першыя паездкі літаральна на мінулым тыдні. «І я ехала не на пасажырскім сядзенні, а сама была вадзіцелем, — адзначае Вольга. — У мяне ўласны аўтамабіль, захацелася з'ездзіць да бацькоў у Віцебск».

Дзяўчына зарэгістравалася на расійскім сайце, прапанавала свой маршрут і стала чакаць. «З таго моманту, як сэрвіс пацвердзіў паездку, прайшоў літаральна дзень — і я ўжо знайшла сабе спадарожнікаў, — адзначыла Вольга. — Так, былі невялікія складанасці: некаторым спадарожнікам, якія пагадзіліся ехаць са мной, я не магла датэлефанавацца. Давялося адмовіць ім і шукаць новых пасажыраў, але і яны знайшліся вельмі хутка».

Пасля таго, як тры пасажыры былі зацверджаны, яна вывучыла іх профілі, якія былі прывязаныя да сацыяльных сетак. «У асноўным гэта былі студэнты, нічога негатыўнага я не ўбачыла», — адзначыла Вольга.

На сваю першую паездку Вольга ўстанавіла цану, якая была крыху ніжэйшай за рэкамендаваную сэрвісам, — 9 рублёў з чалавека. «Гэта танней за маршрутку, але крыху даражэй за цягнік. Але ж той жа цягнік не заўсёды ходзіць у зручны час, — патлумачыла дзяўчына. — Дарэчы, нягледзячы на ўсталяваную цану, пасажыры ўсё роўна заплацілі па 10 рублёў. На зваротную паездку была тая ж цана».

— Паліва на дарогу туды і назад я адбіла цалкам. І гэта пры тым, што мая машына не самая эканамічная. Атрымалася так, што для мяне гэтыя паездкі выйшлі бясплатнымі, так што планую і далей карыстацца падобным сэрвісам, — дадала дзяўчына.

**Супрацоўніца юрыдычнай кампаніі «Мартыненка і партнёры» Юлія ДЫМША** карыстаецца карпулам з гэтага года ў якасці пасажыра. «Звычайна раблю гэта раз у месяц, — кажа дзяўчына. — Еджу з Мінска ў Бярозу дадому. Калі параўноўваць з плацкартам, то выходзіць на два рублі даражэй».

Бяспеку Юлію хвалявала не надта. «Усё гэта цяпер маніторыцца, у любым выпадку, калі нешта пойдзе не так і дамоўленасць не выканаецца, то магу ўсё пракантраляваць самастойна, паколькі я юрыст, — адзначыла яна. — Перш, чым паехаць, вывучаю профіль кіроўцы. Як правіла, калі ёсць фатаграфія чалавека, паказаны тэлефон, ёсць водгукі, то хутчэй за ўсё ты абярэш добры варыянт».

— Тры самыя вялікія перавагі карпулу? Па-першае, гэта хутка. Па-другое, гэта зручна, таму што кіроўца падладжваецца пад цябе, можа даставіць цябе куды заўгодна. Па-трэцяе, гэта камфортна, — рэзюмавала Юлія.

## ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ

Карпул у Беларусі актыўна працуе: расійскія інтэрнэт-пляцоўкі прапануюць мноства варыянтаў на розны цэнавы дыяпазон. Кожны можа знайсці сабе зручны маршрут на зручны час. Ёсць сэнс выбіраць падобны сэрвіс як на кароткія, так і на доўгія паездкі, а на апошніх з дапамогай карпулу можна сэканоміць значныя сродкі. Але ўсё ж такі асцярожнасць не перашкодзіць: варта вывучаць профілі магчымых спадарожнікаў. Карпул — выдатная альтэрнатыва, калі расклад цягнікоў і аўтобусаў не падыходзіць, а дабрацца да месца трэба хутка і пажадана ў камфортных умовах.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

# ЗБЕГЧЫ АД БАГДАДА

## Якія перспектывы ў іракскага Курдыстана?

**Рэферэндум аб незалежнасці іракскага Курдыстана, які прайшоў на мінулым тыдні, — сапраўды знакавая падзея для Блізкага Усходу. І справа не толькі ў тым, што курды, якія не мелі ўласнай дзяржавы, падышлі да яе стварэння як ніколі блізка, але і ў тым, што Ірак, які пахіснуўся пад націскам «Ісламскай дзяржавы», яшчэ больш набліжаецца да распаду. Што датычыцца курдаў, то атрыманы імі пасля падзення рэжыму Садама Хусейна статус аўтаноміі ўжо даўно дазволіў стварыць сваю квазідзяржаву, якая насамрэч існуе асобна ад астатняй краіны. Дык навошта тады спатрэбіўся вераснёўскі плебісцыт, і якія ён будзе мець наступствы?**





### 50 мільёнаў без дзяржавы

Аб курдах рэгулярна згадваюць у навінах з Блізкага Усходу. Пра іх гавораць як пра сілу, што эфектыўна супрацьстаяла баевікам «Ісламскай дзяржавы» ў Сірыі і Іраку, і як пра радыкальную апазіцыю кіруючаму рэжыму ў Турцыі. Увогуле гэта самы вялікі ў свеце этнас без уласнай дзяржаўнасці. Па розных ацэнках, усяго курдаў налічваецца ад 20 да 50 мільёнаў. Тэрыторыя іх кампактнага пражывання — турэцкі, іракскі, іранскі і сірыйскі Курдыстан (турэцкі — самы вялікі па плошчы і колькасці курдаў, далей у парадку змяншэння). Усе гэтыя рэгіёны мяжуюць паміж сабой. Калі кажуць проста «Курдыстан», маюць на ўвазе адразу значную тэрыторыю, якую займае этнас. У цяперашніх межах ён склаўся не так даўно — каля ста гадоў таму. Ёсць значныя курдскія дыяспары на постсавецкай прасторы — у Арменіі і Грузіі, на расійскім Паўночным Каўказе. У 1930-х курды з'явіліся ў рэспубліках Сярэдняй Азіі, куды іх выслалі з Закаўказзя. Самая вялікая еўрапейская дыяспара ў Германіі — каля мільёна чалавек. Яе нефармальнай сталіцай лічыцца Дзюсельдорф.

Ці існавала калі-небудзь незалежная курдская дзяржава — пытанне спрэчнае, піша lenta.ru. Гэтаксама як і пытанне пра паходжанне гэтага этнасу. Курдамі ў некаторых раёнах Ірана дагэтуль называюць усіх, хто вядзе качавы лад жыцця. Прарадзіма курдаў — горы Заграс, размешчаныя на захадзе Ірана, уздоўж мяжы з Іракам. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ў Сярэднявеччы гэты этнас ужо сфарміраваўся. Адной з яго адметных рыс доўгі час была рэлігія езідызм, вызнаваная толькі курдамі. Сёння, аднак, пераважная іх большасць (да 90 працэнтаў) — прыхільнікі ісламу сунніцкага толку. Езіды лічаць іх вераадступнікамі, а сябе — сапраўднымі курдамі. Дакладных звестак пра асновы веравучэння езідаў мала. Закрытасць іх суполак спрыяла распаўсюджванню рознага кшталту чутак і здагадак.

### Прывабны Кіркук

Курды ў Іраку дзеляцца на два вялікія субэтнасы — курманджы (жывуць у Турцыі, Сірыі і паўночных раёнах іракскага Курдыстана) і сарані (Ірак і Іран). Ёсць і больш малалікія субэтнасы, але яны асаблівай ролі ў палітыцы Блізкага Усходу не адыграюць. У Іраку дэ-факта ўжо сфарміравана незалежная курдская дзяржава — рэгіён Курдыстан Іракскай рэспублікі. Складаецца з чатырох правінцый: Эрбіль, Сулейманія, Халабджа і Дахук. Пад кантролем курдаў знаходзяцца горад Кіркук і прылеглыя да яго нафтаносныя тэрыторыі (разам з Басрай, Кіркук — найбуйнейшае нафтавае радовішча Ірака). Насельніцтва гэтага месца змяшанае — тут жывуць і курды, і арабы. Таму гістарычна Кіркук быў спрэчнай тэрыторыяй. Але пасля таго як іракская армія ў прамым сэнсе збегла адтуль у чэрвені 2014-га, ратуючыся ад надыходзячых атрадаў ІД, курдскія ваенныя фарміраванні пешмерга (паводле розных ацэнак, цяпер налічваюць у сваіх шэрагах каля 200 тысяч байцоў) хутка ўзялі горад і навакольлі пад свой кантроль. Адбіўшы атакі ісламістаў, курды атрымалі магчымасць распараджацца кіркукскім «чорным золатам» па сваім меркаванні. За выключэннем Кіркука, тэрыторыя іракскага Курдыстана — монаэтнічная, насельнае амаль выключна курдамі.

На самым паўночным усходзе ёсць адрэзак, дзе курдскія раёны сутыкаюцца з тымі, што падкантрольныя Багдаду. Хоць узброеныя сутыкненні паміж праўладнымі сіламі і пешмерга тут здараліся (былі і забітыя, і параненыя з абодвух бакоў), казаць аб якім-небудзь сур'ёзным канфлікце нельга — іракскія ўлады занадта занятыя цяпер барацьбой з ІД. Іракскі Курдыстан звязаны, па сутнасці, з Багдадам толькі адзінай валютай — дынарам, эмісійны цэнтр якога знаходзіцца на арабскай тэрыторыі. Таму абвяшчанне фармальна аб'явіць аб суверэнітэце аўтаноміі перашкаджае цяпер толькі Багдад — абвяшчэнне незалежнасці стане прадметам гандлю ва ўнутрыіракскай палітыцы.

Як заўважаюць эксперты, аўтаномія не мае палітычнага адзінства — Дахук і Эрбіль кантралюе ліберальна-нацыяналістычная Дэмакратычная партыя Курдыстана (ДПК) цяперашняга прэзідэнта Масуда Барзані, у Сулейманіі і Халабджы ўлада належыць сацыял-дэмакратычнаму патрыятычнаму саюзу Курдыстана (ПСК). Партыі варагуюць. У 1990-х паміж імі ішла вайна, якую ўдалося скончыць пры пасрэдніцтве ЗША. ДПК падтрымліваецца Турцыяй, ПСК — Іранам. Ні тая, ні іншая перамовы аб аб'яднанні з іншымі «Курдыстанамі» не вядзе.



### Козыр Барзані

Наўрад ці прэзідэнт іракскага Курдыстана Масуд Барзані разлічваў на нейкую іншую рэакцыю. І ўсё ж на рэферэндум ён пайшоў. Вынік быў прагназуемы — каля 93 працэнтаў удзельнікаў плебісцыту сказалі «так» незалежнаму іракскаму Курдыстану. Прычыну варта шукаць у працэсах, якія адбываюцца ў рэгіёне. Апошнія месяцы, па меншай меры, як арганізаваная сіла тут дажывае групоўка «Ісламская дзяржава». Яе пазіцыі ў Іраку падарваныя вельмі моцна. У Сірыі, калі не адбудзецца чагосьці экстраардынарнага, ад «Ісламскай дзяржавы» хутка зусім нічога не застанецца. І важны, а недзе і вырашальны ўклад у справу разгрому рэлігійных радыкалаў у абедзвюх краінах унеслі курдскія фарміраванні, якія арыентуюцца на ЗША, Турцыю, Іран. У адрозненне ад забюракратызаваных, непаваротлівых армій арабскіх дзяржаў, якія раздзіраюць этнічныя і канфесійныя супярэчнасці, узброеныя групоўкі, што ствараюцца і базуюцца ў значнай меры на поўначы Ірака, праявілі сябе ў баях з праціўнікам з самага лепшага боку. Паўплывалі і высокая матывацыя, і таксама вайсковыя традыцыі і баявы вопыт.

У гэтых умовах як ніколі актуальным з'яўляецца пытанне пра плату, на якую разлічваюць курды ў абмен на сваё супрацоўніцтва ў барацьбе з ІД. Міжволі напрошваюцца аналогіі з Першай сусветнай вайной. Тады курдскія фарміраванні аказалі немалую дапамогу саюзнікам у барацьбе з Асманскай імперыяй. Сеўрскім дагаворам 1920-га стварэнне незалежнага Курдыстана прадугледжвалася. Але ўжо праз тры гады тэрыторыя гіпатэтычнай дзяржавы была падзелена паміж Турцыяй, Францыяй (цяперашняй Сірыяй, якая знаходзілася тады пад яе кантролем) і Англіяй (Іракам). Пераможцы Асманскай імперыі палічылі, што ўзнімаць выбухованебяспечнае курдскае пытанне занадта небяспечна і немэтазгодна. Вялікая верагоднасць, што гэтак жа вырашаць і пасля перамогі над ІД. Статус-кво, які склаўся на поўначы Ірака, у прынцыпе задавальняе ўсіх міжнародных гульцоў. З 1991 года, з таго моманту, як мясцовыя курды пасля аперацыі «Бура ў пустыні» былі ўзятыя пад міжнародны пратэктарат, каб засцерагчы іх ад Садама Хусейна, тут дэ-факта існуе незалежная дзяржава, непрызнаная, але якая цалкам адбылася. Тут пражываюць пяць мільёнаў чалавек, аўтаномія мае ўласнае войска, эканоміку, якая базуецца на экспарце нафты, заключае на законных падставах міжнародныя кантракты, праводзіць незалежную знешнюю палітыку. Маюцца і свае тэрытарыяльныя спрэчкі, і геапалітычныя амбіцыі. Тое, што юрыдычна ўсё гэта называлася аўтаноміяй у складзе Ірака, вядома, нікога не падманвала. Курдыстан — рэгіён краіны, што жыве вось ужо дваццаць шэсць гадоў сваім жыццём, якое ў многіх адносінах куды лепшае, чым у арабскіх суседзяў. Эрбіль гадамі быў аазісам спакою ў смутным рэгіёне. Улады Курдыстана рабілі выгляд, што яны падпарадкоўваюцца Багдаду, а той, у сваю чаргу, рабіў выгляд, што так яно і ёсць.

Пакуль відавочнае наступства рэферэндуму адно: ён стане козырам у перамовах Курдыстана і цэнтральнага ўрада Ірака. Казаць ёсць пра што — перш за ўсё аб статусе горада Кіркук і аднайменнай правінцыі. Паводле канстытуцыі Курдыстана, ён уваходзіць у яго склад. Улады Ірака, наадварот, лічаць, што гэты раён часткай аўтаноміі не з'яўляецца. Сітуацыю ўскладняе тое, што ні курды, ні іракская армія не з'яўляюцца ў Кіркуку паўнаўладнымі гаспадарамі. Частка правінцыі — пад кантролем ІД. Таму вызначаць, каму яна адыдзе, прыйдзецца на перамовах пасля перамогі. На іх юрыдычнае аддзяленне ад Ірака, верагодна, акажацца самай дзейснай пагрозай з боку Барзані.

### Два долары за бараль

Міжнародная супольнасць адрэагавала на рэферэндум стрымана. У ААН выказалі занепакоенасць «патэнцыйна дэстабілізуючым эфектам». Згодна са спецыяльнай заявай ад 25 верасня, «генеральны сакратар паважае суверэнітэт, тэрытарыяльную цэласнасць і адзінства Ірака і лічыць, што ўсе нявырашаныя пытанні паміж федэральным урадам і рэгіянальным урадам Курдыстана павінны быць вырашаны з дапамогай структураванага дыялогу і канструктыўнага кампрамісу». Заклікі да Багдада і Эрбіля вырашаць спрэчныя пытанні за сталом перамоў утрымліваюцца ў афіцыйнай пазіцыі многіх краін, такую магчымасць не адкідваюць і самі канфліктуючыя бакі. Курдскае кіраўніцтва выказала надзею, што рэферэндум заахвоціць Багдад аб'ектыўна ацаніць рэаліі і разам шукаць магчымасці мірнага суіснавання. Прэм'ер-міністр Ірака Хейдар аль-Абадзі са свайго боку адзначыў: «Я ніколі не зачыню дзверы для перамоў. Перамовы заўсёды магчымыя». Такім чынам, ніхто не спальвае масты і апакаліптычныя прагнозы заўчасныя. Рана ці позна федэральным уладам і кіраўніцтву курдскай аўтаноміі давядзецца ўрэгуляваць праблемы, чаму будзе папярэднічаць працяглы гандаль.

Характэрна, што ў Эрбілі вельмі міралюбна адрэагавалі на пагрозы Турцыі ўвесці санкцыі. «Мы не хочам, каб паміж намі і нашымі суседзямі паўстала якая-небудзь праблема», — адзначыў прэзідэнт Масуд Барзані. І гэта не дзіўна — іракскі Курдыстан экспартуе сваю нафту на міжнародныя рынкі праз турэцкі порт Джэйхан. Турцыя і сама купляе ў аўтаноміі нафту і прыродны газ. Гандлёвы абарот паміж Турцыяй і Курдыстанам сёлета ў першым паўгоддзі дасягнуў 5 млрд долараў, што на 20% больш, чым за аналагічны перыяд летась. Так што за жорсткай палітычнай рыторыкай праглядаюцца прагматычны эканамічны разлік і рацыянальны падыход. Рэзка змянілі акцэнты і ў Вашынгтоне: дарадца прэзідэнта ЗША па нацыянальнай бяспецы Герберт Рэймонд МакМастэр сказаў: «Мы павінны пачакаць, каб убачыць, што адбудзецца». У Маскве адначасова з заявамі аб падтрымцы адзінства і тэрытарыяльнай цэласнасці Ірака пралічваюць верагодныя кірункі развіцця становішча.

Звяртаюць на сябе ўвагу паведамленні аб тым, што сёлета Расія стала ключавым інвестарам у іракскі Курдыстан, адцясніўшы ЗША і Турцыю. Так, толькі «Раснафта» мае намер інвеставаць у развіццё нафтагазавай інфраструктуры больш за 4 млрд долараў, а з 2020 года гэтая кампанія плануе стаць вядучым экспарцёрам энерганосьбітаў з Курдыстана на еўрапейскія рынкі. Няма сумненняў, што перад прынясцем такіх глабальных рашэнняў старанна выяўляюцца пагрозы і ацэньваюцца рызыкі, а таму будучыня іракскага Курдыстана бачыцца стабільнай.

Гэта адзін з найважнейшых нафтавых рэгіёнаў свету. А выніку плебісцыту рэальна могуць змяніць расстаноўку сіл на Блізкім Усходзе, паколькі ў такім выпадку Багдад страціць больш за палову сваіх рэсурсаў вуглевадародаў. Шосты ў свеце Ірак з'яўляецца другім па велічыні вытворцам нафты ў АПЕК. Курдыстанскае «чорнае золата» складае 60% усёй вуглевадароднай сыравіны, якая здабываецца ў краіне. Шляхам прамых пагадненняў з курдскім урадам сюды прыйшлі замежныя нафтаздабыўныя кампаніі. Амерыканскія ExxonMobil і Chevron вядуць разведку ў рэгіёне з 2012 года, калі падпісалі пагадненне з паўаўтаномным урадам. У іракскім Курдыстане працуе турэцкая Genel Energy, нарвежская DNO, рэгіянальны гулец Gulf Keystone Petroleum. Звестак аб тым, колькі нафты пастаўляецца з аўтаноміі, у іракскага ўрада няма. Аналітыкі і эксперты таксама не могуць назваць дакладныя лічбы. Сам урад іракскага Курдыстана ацэньвае запасы рэгіёна ў 45 млрд барэляў (больш за 6 млрд тон), і гэта лёгкая нафта з нізкім сабекоштам здабычы — каля $2 за бараль, як у Саудаўскай Аравіі і Кувейце. Па велічыні запасы іракскага Курдыстана лічацца шостымі ў свеце.

Курды не хочуць, каб у вялікай гульні, якія вядуць сусветныя дзяржавы на Блізкім Усходзе, інтарэсы гэтага падзеленага народа чарговы раз аказаліся забытыя. Барзані прапануе абмяркаваць статус рэгіёна і заклікае суседзяў дапамагчы яму ў дыялогу з Багдадам: «Замест таго каб пагражаць нам пакараннем, давайце пачнём сур'ёзныя абмеркаванні. Мы не хочам праблем ні з адной краінай у рэгіёне». У інтэрв'ю тэлеканалу Sky News лідар іракскіх курдаў паведаміў, якія далейшыя крокі на шляху будаўніцтва незалежнай курдскай дзяржавы будуць прынятыя пасля плебісцыту. Паводле яго слоў, 1 лістапада тут пройдуць прэзідэнцкія і парламенцкія выбары. На пытанне, ці застанецца ён лідарам іракскага Курдыстана пасля абвяшчэння незалежнасці, Масуд Барзані адказаў адмоўна, паведаміўшы, што не будзе ўдзельнічаць у выбарах і завершыць палітычную кар'еру, вярнуўшыся на службу ў курдскія ваенізаваныя фарміраванні пешмерга.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*

■ Руплівым гаспадарам

# Смак восені

**Парэчкі і агрэст адышлі, год выдаўся няяблычны... І ці не са жніўня мы сядзім без салодкіх вітамінаў... Давайце выпраўляць становішча, сёння можна ствараць такія ўчасткі, якія будуць радаваць пладамі да самых маразоў. Калі я выбралася ў сады Інстытута пладаводства НАН Беларусі, была ўражана, колькі ўсяго можна назбіраць восенню.**

— Бузіна багата каліем, мікраэлементамі, гэта цудоўны фарбавальнік для яблычных сокаў, — паказваюць мне расліну, пакрытую гронкамі з дробных чорных ягад.

Уражвае сваім колерам гранатавая рабіна (гэта культура з'явілася ў выніку скрыжоўванняароніі і звычайнай рабіны). Невысокая, дэкаратыўная і непатрабавальная, яна добра пачувала б сябе на любым участку.

Верасень — час для збору кізілу. Не трэба думаць, што гэта выключна паўднёвая расліна, і тыя, каму спадабаліся кампоты і пасціла з гэтых цудоўных пладоў, з цягам часу могуць рабіць іх і ў Беларусі. Кізіл цудоўна ў нас расце.



Ну а прыгажуню каліну наогул ужо пачалі выкарыстоўваць у якасці дэкаратыўнага элемента. Вясной яна цешыць раскошным цвіценнем, а бліскучыя ягады можна збіраць і ў кастрычніку. Між іншым, лепшага прыроднага болесуцішальнага сродку не прыдумаеш, а яшчэ яна добрая для тых, у каго праблемы з ціскам. Так, ягады каліны гарчаць, трэба яшчэ ведаць як іх падаць. На Урале, напрыклад, каліну змешваюць з мёдам, начыняюць пірагі, цудоўны з яе морс. Дарэчы, першыя 2—3 гады пасля пасадкі каліна «прыглядаецца» да новых мясцін: здаецца, замерла і не расце, а пасля пачне «выстрэльваюць», і ўжо на чацвёрты год яна аддзячыць ураджаем.

— Незаслужана ў нас абыходзяць увагай актынідыі аргуту і каламікту. Гэта ліяны. Асаблівасць раслін у тым, што ім патрэбна пара (можна чатыры жаночыя расліны, адну мужчынскую). Галоўныя ворагі актынідыі — каты. Карані яе пахнуць валяр'янкай. Жывёлы разграбаюць маладыя пасадкі, і ў выніку зімой расліна можа загінуць з-за парушанай каранёвай сістэмы. Таму раім садаводам агароджваць актынідыі металічнымі сеткамі. У астатнім расліна не патрабуе асаблівага догляду, выдатна зімуе, — расказвае **загадчык лабараторыі генетычных рэсурсаў ягадных культур Інстытута пладаводства Людміла ФРАЛОВА**, і папаўняе нашу кашолку зялёнымі пладамі (дарэчы, вельмі салодкімі, натуральна, смак як у ківі).

Гронка каліны, рэмантантная маліна, барбарыс, глог, шыпшына, аронія. Восьяны — колеры восені. Эх, выкласці б такое багацце дзе на прылаўку і ладзіць дэгустацыю. Ці змогуць людзі адгадаць, чым іх частуюць? Напрыклад, што гэта за авальная ягадка, якая па смаку так нагадвае вішню, чарэшню (кізіл)? А гэты жоўты «яблычак» насамрэч — плод хенамелеса, і, калі ласка, не збытайце ажыну і шаўкоўніцу...

І чаму б пры закладцы саду не звярнуць увагу на такія навінкі?

***— А якія з культур увосень не садзяць?*** — цікаўлюся ў Людмілы Уладзіміраўны.

— Саджанцы з закрытай каранёвай сістэмай, можна садзіць на працягу ўсяго сезона. А калі яны з адкрытай каранёвай сістэмай, як правіла, большасць пасадак прыпадае на восень. Проста тут у нас больш часу (і асноўныя работы на агародзе зроблены, і расліна знаходзіцца ў стане анабіёзу). У нашым распараджэнні каля паўтара месяца (з канца верасня і ўвесь кастрычнік). А вясной у нас — усяго пара тыдняў ці менеі, пры хуткім пацяпленні расліны прачынаюцца. Часам людзі садзяць іх ужо з лістамі, якія пасля пажадана абстрыгчы, атрымліваецца, расліна на іх рост дарэмна патрачіла пажыўныя рэчывы. Увосень не рэкамендуем садзіць актынідыю і ажыны. Нагадаем, што ажыны абавязкова трэба зімой укрываць, гэта кашэннем, да таго ж прыцягвае пчол. Дарэчы, маліну не трэба садзіць у міжрадддзях пладовага саду — расліне з паверхневай каранёвай сістэмай будзе дрэнна. У міжрадддзях яблыневага саду лепш пасадзіць парэчкі.

***— Якія культуры варта «сяліць» на ўчастку побач з рэчкай?***

— Ідэальна пасадзіць там парэчкі, бо ўжо ў самой назве расліны закладзена, дзе яна расце. Так, гэта культура менш патрабавальная да ўрадлівасці глебы, але больш «уважлівая» да вільгаці. На жаль, сёння людзі забываюцца на чырвоныя і белыя парэчкі, а такі багаты пектынамі прадукт яшчэ трэба пашукаць. Калі ёсць магчымасць надзадзіць паліў, выдатна каля рэчкі сябе будуць адчуваць суніцы. А вось ажынам каля вады будзе холадна.

***— Ці трэба ўкрываць маладыя пасадкі?***

— Як правіла, людзі не ўкрываюць тое, што садзяць восенню. Але што трэба зрабіць абавязкова, дык гэта замульчыраваць глебу. Мульча бывае арганічная (салома, сена, льнокастры, кара дрэў, аплікі, лузга грэчкі, торф, скошаная трава, лісце) і неарганічная (спанбонд, плёнкі, агратканіна, сярод новага кірунку — плёнкі, якія самі раскладаюцца).

***— Калі азот унесці пры асеннай пасадцы, як гэта можа адбіцца на расліне?***

— Па-першае, можна апячы карані, пры пасадцы любое ўгнаенне трэба абавязкова перамяшаць з глебай. Кожная гранула — гэта найвысачэйшыя канцэнтрацыі рэчыва, калі яна трапляе на маладзенькія карэнчыкі, гэта ўсё адно, што чалавеку на руку капнуць кіслатой. А яшчэ азот за зіму вымываецца — лічыце, што проста дарэмна патрацілі грошы. Акрамя таго, азотнымі ўгнаеннямі вы можаце стымуляваць рост раслін, калі гэтага не трэба. Калі зацяжная восень, расліна будзе вегетаваць, а не рыхтавацца да зімы. Так, калі падкарміць бружмель, ён пачне паслухмяна развівацца. Гэта культура хутка засынае і рана прачынаецца. Калі ў лютым бываюць адлігі, яна можа пачаць вегетаваць, квітнець. А з вяртаннем маразоў усё гіне. Пазней яна можа зноў выпусціць кветкі, але ўжо менш, бо сілы былі раней дарэмна патрачаны. Але, дзякуючы селекцыянерам, мы ўжо маем два айчынныя сарты бружмелю, адаптаваныя да нашага клімату.

***— Ці ёсць іншыя перавагі ў асенняй пасадцы, усё ж калі мы набываем саджанец у такі час, можам бачыць лісты, і меркаваць па іх пра здароўе расліны...***

— Важна глядзець не на лісты, а на карані, каб яны былі неперасохлыя, без уздуццяў, каб былі развіты (звярніце ўвагу і на скелетныя, і на маладыя карані, што адрастаюць). Наземная частка расліны павінна быць без паломаў, трэшчын. Калі пашкодзіўся ствол, ранку трэба замазаць садовым варам ці фарбай. А вось лістоў на саджанцы не павінна быць. Яны дарэмна з расліны забіраюць вільгаць. Калі вы ўсё ж купілі матэрыял з лістамі, абарвіце іх і абавязкова перад пасадкай апусціце карані расліны ў ваду. Многія расліны можна ўкараніць (дарэчы, гэта абароніць і ад крадзяжу ў тых мясцінах, дзе зладзеі выкопваюць навасадкі). Нават парэчкам асенняя «стрыжка» не пашкодзіць, а абрэзаныя галінкі можна пусціць на чаранкі, укараніць. Абавязковы паліў пасля пасадкі, нават пасля дажджу, — так усе пустоты выйдуць і зямля ляжа на каранях. Некаму можа падацца дзіўным, што ў кастрычніку, калі дрэвы і кусты стаяць голыя, іх трэба паліваць. Але пры сухой восені такія вільгацезарадныя палівы вельмі карысныя для раслін. Нездарма людзі не любяць, калі мароз на голую зямлю кладзецца, справа тут не столькі ў снезе, колькі ў тым, што ён утрымлівае вільгаць.

датычыцца і дарослых раслін, што ўжо казаць пра маладзенькія.

***— Толькі людзі разабраліся з градамі і вырашылі частку агарода пусціць пад сад. Ці можна садзіць ягаднікі, напрыклад, пасля бульбы?***

— Лепшыя папярэднікі для ягадных культур — зяленіўныя (кроп, пятрушка), бабовыя, часнок, цыбуля, таксама кветкі — календула і аксамітк (яны выдатна «чысцяць» зямлю, напрыклад, ад нематоды). А пасля тамата і бульбы лепш адразу сады не садзіць, а засеяць зямлю сидэратамі. Для культур, якім патрэбны жаночыя і мужчынскія формы (такім як актынідыя, абляпіха), трэба ўлічваць ружу вятроў, каб сама прырода садзейнічала іх апыленню. А вось у глухіх месцах лепш уладкаваць ажыны.

***— Што будзе расці ў цені, пад яблынямі?***

— Практычна ўсе культуры любяць святло, у тым ліку ягадныя. Трэба загадзя планаваць участак, выбіраць расліны на карлікавых (паўкарлікавых) падвоях. Цяпер ёсць і грушы, вішні, слівы на клонавых падвоях. Вельмі добрыя каланавідныя яблыні, іх можна выкарыстоўваць замест агароджы. Таксама трэба памяншаць крону дрэў, фармаваць расліну, каб займала мінімум плошчы. Трэба мяняць менталітэт: сёння, калі моцна абрэзаць дрэва, бабулі будуць стаяць і плакаць. Але чым больш мы рэжам, тым буйнейшыя плады. Трэба працаваць не на колькасць, а якасць. Тое ж і з рэмантантнай малінай, напачатку людзі лічылі ці ні дзікунствам, што яе трэба абрэзаць пад нуль. Дарэчы, такія абрэзкі можна рабіць і восенню, і вясной. Побач з малінай можна пасеяць белую канюшыну, яна невысокая і не «дадае» праблем з

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
dziadziula@zviazda.by

■ Прававая гасцёўня

# АБАРАНІЦЦА ЗА МЯЖОЙ,

## захаваўшы свабоду, маёмасць і аліменты

**Даказаць сваю дзеяздольнасць, устанавіць факт смерці, скасаваць шлюб, выступіць сведкам у судзе і вырашыць многія іншыя юрыдычныя пытанні за мяжой беларусы могуць на тых жа ўмовах, што і мясцовыя жыхары. Правы і інтарэсы нашых суайчыннікаў абараняюцца шматі двухбаковымі дагаворамі, канвенцыямі і пагадненнямі па аказанні прававой дапамогі па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах у больш чым 100 дзяржавах свету, з якімі ў Беларусі заключаны міжнародныя дагаворы аб прававой дапамозе.**

### МОЙ СУД МЯНЕ БЕРАЖЭ



— Уступаючы ў прававыя зносіны з замежнымі грамадзянамі або арганізацыямі, беларусы могуць быць упэўнены, што іх асабістыя і маёмасныя правы абаронены гэтак жа, як і карэнных жыхароў дзяржаў, з якімі Беларусь звязваюць міжнародныя абавязацельствы, — расказала **Марына ЖАНДАРАВА, начальнік аддзела выканання міжнародных дагавораў упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі.** — Нашы суайчыннікі самастойна або праз прадстаўніка могуць заяўляць хадайніцтвы і падаваць іскі ў суд, а таксама звяртацца ў іншыя ўстановы юстыцыі, кампетэнтныя ў пэўных пытаннях.

Больш за тое, яны вызваляюцца ад выплаты і кампенсавання судовых натарыяльных пошлін і выдаткаў і карыстаюцца бясплатнай юрыдычнай дапамогай.

Калі беларуса выклікаюць у суд замежнай краіны ў якасці сведкі, ён таксама абараняецца дагаворамі аб прававой дапамозе і мае права на пакрыццё дарожных выдаткаў, кошту знаходжання ў дзяржаве і страчанага заробку.

Сведку, які з'явіўся па выкліку ва ўстанову юстыцыі замежнай дзяржавы, не могуць прыцягнуць да адказнасці за злачынства або правапарушэнне, арыштаваць, пазбавіць волі або прымусіць адбываць пакаранне за тое, што здзейснена ім да перасячэння дзяржаўнай мяжы дзяржавы, якая яго выклікала.

— Сведку нельга прыцягнуць да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці, узяць пад варту або пакараць у сувязі з яго паказаннямі ці ўчынкам, які з'яўляецца прадметам разбіральніцтва, — растлумачыла спецыяліст. — Аднак ён не змога скарыстаца гэтай прывілеяй, калі не пакіне тэрыторыю замежнай дзяржавы на працягу 15 сутак з моманту паведамлення, што яго прысутнасць больш не патрэбная. Адзінае апраўданне непрытрымлівання тэрмінаў пры гэтым — немагчымасць пакінуць краіну праз абставіны, якія не залежаць ад сведкі.

### ЗАМОРСКАЯ ПАЛОВА І АЛІМЕНТЫ

Дагаворамі аб прававой дапамозе рэгулююцца таксама і пытанні шлюбу паміж грамадзянамі розных дзяржаў. Умовы заключэння шлюбу вызначаюцца для кожнага з будучых сужэнцаў заканадаўствам дзяржавы іх грамадзянства, а форма шлюбу — законамі краіны, дзе маладыя жэняцца.

— Такія ж патрабаванні, дарэчы, прымяняюцца і пры жаніцьбе нашага грамадзяніна з асобай замежнай дзяржавы, з якой у Беларусі няма дагавора, — удакладніла Марына Жандарава. — Калі іншаземец не выканае ўмовы, прадугледжаныя заканадаўствам краіны яго грамадзянства, то шлюб можа быць не прызнаны на тэрыторыі замежнай дзяржавы.

Асабістыя і маёмасныя прававадносіны паміж мужам і жонкай розных дзяржаў вызначаюцца законамі краіны іх сумеснага пражывання. Калі ж яны жывуць у розных дзяржавах, то гэтыя стасункі будуць абумоўлівацца правам краіны іх апошняга месцажыхарства.

Праваадносіны паміж бацькамі і дзецьмі рэгулююцца законамі краіны сумеснага пражывання сям'і, аднак калі бацькі жывуць у розных дзяржавах — заканадаўствам грамадзянства дзіцяці.

Калі сямейнае жыццё прыходзіць да разводу, заява на скасаванне шлюбу паміж грамадзянамі розных дзяржаў разглядаецца ў краіне пражывання мужа і жонкі. Калі сужэнцы жывуць на тэрыторыях розных краін, кампетэнтным пры разглядзе справы будзе суд дзяржавы, куды пададзена заява.

— Беларус, жанаты, напрыклад, з літоўкай, якая жыве ў Літве, можа звярнуцца за скасаваннем шлюбу ў беларускі суд. Такое ж права падаць іск да мужа ў літоўскі суд ёсць і ў яго жонкі, — дадала прадстаўніца Мінюста.

Спагнанне аліментаў з былой паловы таксама знаходзіцца ў юрысдыкцыі міжнародных прававых дагавораў. Беларус падае адпаведную заяву ў суд па месцы свайго жыхарства, а рашэнне айчыннага судовага органа выконваецца на тэрыторыі замежнай дзяржавы, дзе знаходзіцца аліментшчык.

Дазвол на прымусовае выкананне рашэння беларускага суда, выдадзенае судом замежнай дзяржавы, мае такую ж сілу, як і рашэнне нацыянальнага суда. Судовы выканаўца атрымлівае выканаўчы ліст, што з'яўляецца падставай для прымусовага спагнання грошай на карысць заяўніка. Спагнаннік аліментаў можа таксама самастойна звярнуцца ва ўстанову юстыцыі замежнай краіны, якая кантралюе выкананне рашэння суда.

**Ірына СІДАРОК.** sidarok@zviazda.by

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
04.10.2017 г.
Лихачевский В. В.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ девятнадцатого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ТАПАС»; сокращенное – ТАА «ТАПАС»;

на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «ТАПАС» (далее – эмитент); сокращенное – ООО «ТАПАС».

2. Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, д. 17, 4-й этаж, офис 14, тел/факс: 8 (017) 3028410, сайт: www.taps.by (далее – сайт эмитента).

3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 27 июля 2001 г. Регистрационный номер 101484246.

4. Уставный фонд эмитента составляет 342 400,10 белорусских рублей.

5. Основной вид деятельности эмитента: реализация проектов, связанных со строительством зданий.

6. Депозитарием эмитента является депозитарий открытого акционерного общества «БПС-Сбербанк» (зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г., регистрационный №25; действует на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1086, выданного 8 декабря 1993 г., срок действия не ограничен; место нахождения: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6).

7. Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает информацию на рынке ценных бумаг путем:

размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Единый информационный ресурс);

публикации в печатных средствах массовой информации (в газете «Звязда») и (или) доводит до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг (далее – Регистрирующий орган).

Информация об изменениях и/или дополнениях, внесенных в Проспект эмиссии жилищных облигаций девятнадцатого выпуска эмитента (далее – Проспект эмиссии) размещается эмитентом на Едином информационном ресурсе, а также публикуется в газете «Звязда» не позднее 7 дней после их регистрации в Регистрирующем органе.

Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает годовой отчет (бухгалтерскую отчетность) в срок не позднее одного месяца после его утверждения в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь о хозяйственных обществах, путем:

размещения на Едином информационном ресурсе;

опубликования в газете «Звязда» либо размещения на сайте эмитента.

Эмитент раскрывает информацию о своей реорганизации или ликвидации, а также о реорганизации дочерних и зависимых хозяйственных обществ эмитента (при их наличии), в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на Едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней:

в случае ликвидации – с даты принятия соответствующего решения Общим собранием участников эмитента;

в случае реорганизации – с даты принятия соответствующего решения Общим собранием участников эмитента, а также с даты государственной регистрации организации, созданной в результате реорганизации; даты внесения в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращении деятельности присоединенной организации.

Кроме того, в случае принятия эмитентом решения о ликвидации (прекращении деятельности), сведения о том, что эмитент находится в процессе ликвидации (прекращения деятельности), подлежат размещению в глобальной компьютерной сети Интернет на официальном сайте юридического научно-практического журнала «Юстиция Беларуси» (www.justbel.info) в порядке и сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.

Эмитент раскрывает информацию о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем:

ее размещения на Едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней с даты получения эмитентом копии заявления в экономический суд о банкротстве эмитента;

публикации в журнале «Судебный вестник Плюс: Экономическое правосудие» в течение 5 календарных дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Эмитент раскрывает информацию о результатах финансово-хозяйственной деятельности, информацию о существенных фактах (событиях, действиях), касающихся его финансово-хозяйственной деятельности, которые могут повлиять на стоимость жилищных облигаций настоящего выпуска, в порядке и сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

8. Общее собрание участников эмитента приняло решение о девятнадцатом выпуске жилищных облигаций 30 августа 2017 г., протокол №б/н.

9. Эмитент является заказчиком (застройщиком) объекта строительства: «Многофункциональный комплекс в границах пр-т Победителей – улиц Ратомской (Браславской) – Тимирязева в г. Минске». 1-я очередь строительства. (далее – Объект строительства).

Государственная экспертиза проектной документации проведена Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза»: заключение государственной экспертизы (положительное) от 4 января 2016 г. №1127-15/15 (в дополнение к заключению государственной экспертизы от 28 декабря 2015 г. №1131-15/15).

Объект строительства входит в состав многофункционального комплекса «Многофункциональный комплекс в границах пр. Победителей – улиц Ратомской (Браславской) – Тимирязева в г. Минске», в котором предусмотрено 11 очередей строительства.

Объектом жилищного строительства по настоящему выпуску облигаций является 1-я очередь строительства – жилой многоквартирный дом №5.1 по г. п. (далее – жилой дом).

Права эмитента на земельный участок, необходимый для обеспечения строительства жилого дома, подтверждены:

свидетельством (удостоверением) №500/1312-5901 от 3 марта 2016 г. о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000007007249.

Нормативная продолжительность строительства – 20,5 месяца, в том числе подготовительный период – 1 месяц.

Предполагаемая дата приемки в эксплуатацию жилого дома – 4-й квартал 2017 г.

10. Облигации девятнадцатого выпуска – жилищные, именные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее – облигации).

Объем выпуска облигаций – 990 000 белорусских рублей.

Количество облигаций – 1500 штук.

Облигация имеет номинальную стоимость 660 белорусских рублей и эквивалент этой стоимости, выраженный в квадратных метрах общей площади жилого помещения в жилом доме, равный 1 квадратному метру. Указанный эквивалент номинальной стоимости остается неизменным.

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

11. Выпуск облигаций зарегистрирован Регистрирующим органом 04.10. 2017 г. Государственный регистрационный номер: 5-200-02-3113.

12. Исполнение обязательств эмитента по облигациям обеспечивается поручительством Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС ПЛЮС» (Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, д. 17, 4-й этаж, офис 19, УНП 190976309). Договор о предоставлении поручительства от 30 августа 2017 г. №б/н.

Поручитель принимает на себя безусловное и безотзывное обязательство солидарно с эмитентом исполнить обязательства перед владельцами 1500 облигаций в объеме 990 000 белорусских рублей в случае неисполнения или ненадлежащего исполнения данных обязательств эмитентом.

13. Размещение облигаций эмитентом осуществляется на неорганизованном рынке путем открытой продажи юридическим и (или) физическим лицам – резидентам и (или) нерезидентам Республики Беларусь (далее – покупатели облигаций).

Дата начала размещения облигаций: 25 сентября 2017 г.

Дата окончания размещения облигаций: 30 марта 2018 г., если иная дата не будет определена Общим собранием участников эмитента в порядке и в сроки, установленные законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах.

Отношения сторон оформляются:

договором с эмитентом, предусматривающим обязательства эмитента по строительству жилых помещений в жилом доме владельцу облигаций, а также иные существенные условия в соответствии с законодательством Республики Беларусь;

договором купли-продажи облигаций, который имеют право заключать покупатели облигаций, заключившие договор с эмитентом.

Для заключения договора с эмитентом и договора купли-продажи облигаций покупатели могут обратиться к эмитенту:

по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 14;

ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Открытая продажа облигаций осуществляется по договорной цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

Средства при проведении открытой продажи уплачиваются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, в безналичной форме, в белорусских рублях, на расчетный счет эмитента №BY34BLBB30120101484246001002 в Открытом акционерном обществе «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29, БИК BLBBBY2X.

14. Срок обращения облигаций – 217 календарных дней (с 25 сентября 2017 г. по 30 апреля 2018 г.).

15. Дата начала погашения облигаций – 30 апреля 2018 г.

Для целей погашения облигаций депозитарий эмитента формирует реестр владельцев облигаций на 23 апреля 2018 г. В случае если дата формирования реестра выпадает на нерабочий день, формирование реестра осуществляется в последний рабочий день, предшествующий нерабочему дню.

Владелец облигаций при погашении (досрочном погашении) облигаций имеет право получить номинальную стоимость облигации либо жилое помещение в жилом доме, общая площадь которых соответствует эквиваленту номинальной стоимости, выраженному в квадратных метрах, принадлежащих ему облигаций.

